# ЗАКОН “АБ КУЛЬТУРЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ”

*Аўтарскі праект кандыдата гістарычных навук Алега Трусава, старшыні ГА “ТБМ імя Ф. Скарыны”.*
*Новая версія*

**Тлумачальная запіска**

Закон "Аб культуры” ў БССР быў прыняты ВС БССР 4 чэрвеня 1991 года. БССР была першай рэспублікай у СССР, якая распрацавала і прыняла адпаведны закон. Ён атрымаў падтрымку ў ВС СССР, і там пачалі рыхтаваць падобны Закон саюзнага значэння, узяўшы за аснову беларускі закон. Аднак у сувязі з распадам СССР яго прыняць не паспелі.

Зараз у нашай краіне гэты закон дзейнічае ў рэдакцыі ад 23 красавіка 2014 года. Савет Міністраў Беларусі распрацаваў Кодэкс Рэспублікі Беларусь "Аб культуры", які мае пяць раздзелаў, 28 глаў і 257 артыкулаў. Зараз ён унесены на разгляд Палаты прадстаўнікоў НС Рэспублікі Беларусь і чакае разгляду ў першым чытанні. Чыноўнікі Міністэрства культуры называюць гэты Кодэкс "культурнай канстытуцыяй" і лічаць, што ён ахоплівае ўсе напрамкі культуры. Аднак сродкі масавай інфармацыі крытычна паставіліся да гэтай ініцыятывы.

Аўтар новай версіі закона аб культуры ўпершыню прапануе новы раздзел (№ 6), які прысвечаны абароне беларускай мовы як асноўнага элемента нашай культуры. Уводзіцца новы артыкул (33), дзе ідзе гаворка пра рэстытуцыю гістарычна-культурных каштоўнасцей Беларусі. У артыкуле 35 даецца вызначэнне панятку "Калекцыя" і акрэсліваецца права ўласніка калекцыі.

Артыкулы 37 і 38 прысвечаны археалагічнай спадчыне і яе ахове. Паколькі рэлігія ва ўсіх яе праявах ёсць неад'емная частка нашай культуры, упершыню прапануецца артыкул 39 "Рэлігійная спадчына", таксама новым з'яўляецца і артыкул 40 "Гістарычна-культурная спадчына і турызм". Уяўляе цікавасць і артыкул 57 "Фундатары і мецэнаты”, дзе ідзе гаворка аб прыцягненні дадатковых фінансавых сродкаў у сферу культуры.

Уведзены таксама прамое і пакватральнае фінансаванне ў сферы культуры на пераходны перыяд, а таксама неабходнасць стварэння грамадскіх радаў пры дзяржаўных структурах у галіне культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗАКОН АБ КУЛЬТУРЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

## ЗМЕСТ

## ПРЭАМБУЛА

Найважнейшымі задачамі Рэспублікі Беларусь у сферы культурнага развіцця з'яўляюцца: адраджэнне і развіццё культурнай спадчыны беларускага народа, яго нацыянальных традыцый, развіццё і пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы, фальклору, народнай творчасці, умацаванне маральна-духоўных асноў грамадства, яго духоўнае абнаўленне на базе прыярытэту хрысціянскіх каштоўнасцей, актыўнае далучэнне да культурных каштоўнасцей, забеспячэнне іх даступнасці для ўсіх пластоў насельніцтва, выяўленне, вывучэнне, ахова і рэстаўрацыя помнікаў матэрыяльнай культуры.

Складовай часткай культуры беларускага народа з'яўляецца яго гістарычна-культурная спадчына.

Гістарычна-культурная спадчына народа Беларусі, створаная ім пад час фарміравання і існавання як ва ўласных дзяржаўных структурах (у Полацкім і іншых старажытных беларускіх княствах, Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, БНР, БССР), так і ў складзе іншых дзяржаўных фарміраванняў (Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР), з'яўляецца яго набыткам, неад'емнай часткай дасягненняў сусветнай цывілізацыі. Яе духоўныя, мастацкія і дакументальныя вартасці ствараюць неабходныя ўмовы духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства.

Нацыянальнымі гістарычнымі сімваламі беларускага народа з'яўляецца герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг.

### Раздзел 1
### Агульная частка

Артыкул 1. Найважнейшыя тэрміны, якія ўжываюцца ў гэтым Законе і іх азначэнні.
Артыкул 2. Заканадаўства аб культуры і яго кампетэнцыя.
Артыкул 3. Дзяржаўная палітыка і дзяржаўнае кіраванне ў галіне культуры.
Артыкул 4. Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб культуры.
Артыкул 5. Суб'екты культурніцкай дзейнасці.
Артыкул 6. Ажыццяўленне і забеспячэнне культурнай дзейнасці.
Артыкул 7. Свабода творчай дзейнасці і яе ажыццяўленне.
Артыкул 8. Сацыяльна-творчыя заказы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Артыкул 9. Кірункі дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры.

Артыкул 10. Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры.

**Раздзел 2**
**Правы і абавязкі грамадзян ў галіне культуры**

Артыкул 11. Правы і абавязкі грамадзян Беларусі, замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства ў галіне культуры.

Артыкул 12. Права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб культурным жыцці.

Артыкул 13. Права на ўдзел у культурным жыцці.

Артыкул 14. Права на захаванне і развіццё нацыянальных традыцый.

**Раздзел 3**
**Арганізацыі культуры**

Артыкул 15. Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры.

Артыкул 16. Асаблівасці ўстаноў культуры як адной з формаў некамерцыйных арганізацый.

Артыкул 17. Стварэнне, дзяржаўная рэгістрацыя і ліквідацыя арганізацый культуры.

**Раздзел 4**
**Творчыя саюзы і калектывы мастацкай творчасці як суб'екты мастацкай дзейнасці**

Артыкул 18. Профілі творчых саюзаў.

Артыкул 19. Правы творчых саюзаў і іх уласнасць.

Артыкул 20. Віды, жанры і формы калектываў мастацкай творчасці.

Артыкул 21. Стварэнне і статус прафесійных і аматарскіх калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры.

Артыкул 22. Правы прафесійных і аматарскіх калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры.

Артыкул 23. Катэгорыі прафесійных і аматарскіх калектываў Рэспублікі Беларусь.

**Раздзел 5**
**Культурныя каштоўнасці**

Артыкул 24. Віды культурных каштоўнасцей.

Артыкул 25. Гістарычна-культурныя каштоўнасці.

Артыкул 26. Класіфікацыя гістарычна-культурных каштоўнасцей.

Артыкул 27. Улік і ахова гістарычна-культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Артыкул 28. Спецыялізаваны дзяржаўны орган аховы гісторычна-культурнай спадчыны.
Артыкул 29. Навукова-метадычная палітыка ў галіне ўліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання, памнажэння і вяртання гістарычна-культурнай спадчыны.
Артыкул 30. Крытэрыі адбору каштоўнасцей.
Артыкул 31. Наданне статуса гістарычна-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 32. Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 33. Рэстытуцыя гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 34. Банк звестак аб гістарычна-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 35. Калекцыя. Права ўласніка калекцыі.
Артыкул 36. Фонд аховы, зберажэння і аднаўлення гістарычна-культурнай спадчыны народа Беларусі.
Артыкул 37. Археалагічная спадчына і яе ахова.
Артыкул 38. Інфармацыя аб археалагічных аб'ектах.
Артыкул 39. Рэлігійная спадчына.
Артыкул 40. Гістарычна-культурная спадчына і турызм.

**Раздзел 6**

**Беларуская мова - асноўны кампанент культуры Беларусі**

Артыкул 41. Статус беларускай мовы.
Артыкул 42. Асноўныя кірункі дзяржаўнай моўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 43. Арганізацыя дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы.
Артыкул 44. Дэпартамент беларускай мовы пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.
Артыкул 45. Дзяржаўная грамадская камісія Дэпартамента беларускай мовы.
Артыкул 46. Дзяржаўная інспекцыя Дэпартамента беларускай мовы.
Артыкул 47. Дзейнасць Міністэрства культуры па забеспячэнні паўнавартаснага функцыянавання беларускай мовы ў сістэме культуры.

**Раздзел 7**

**Парадак дзейнасці асобных тыпаў арганізацый і ўстаноў культуры**

Артыкул 48. Музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Артыкул 49. Бібліятэкі.
Артыкул 50. Клубныя ўстановы.
Артыкул 51. Тэатры, цыркі і канцэртныя арганізацыі.
Артыкул 52. Паркі.
Артыкул 53. Арганізацыі кінематаграфіі.
Артыкул 54. Установы адукацыі і пазашкольнага выхавання.

**Раздзел 8**
**Кадравае і фінансавае забеспячэнне культурніцкай дзейнасці**

Артыкул 55. Падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў культуры.
Артыкул 56. Фінансаванне культурніцкай дзейнасці.
Артыкул 57. Фундатары і мецэнаты.

**Раздзел 9**
**Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва**

Артыкул 58. Задача міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.
Артыкул 59. Прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.
Артыкул 60. Кірункі і прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.
Артыкул 61. Увоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей.

## Раздзел 1

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

### Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні

1.1. Культура - сістэма спецыфічных чалавечых відаў дзейнасці, вынікам якіх становяцца духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці;

Гэта сукупнасць сацыяльна значных ідэй, сімвалаў, каштоўнасцей, ідэалаў, нормаў і правілаў паводзінаў, з дапамогай якіх людзі арганізуюць сваю жыццядзейнасць.

1.2. Культурніцкая дзейнасць - дзейнасць па стварэнні, аднаўленні (адраджэнні), захаванні, ахове, вывучэнні, папулярызацыі, выкарыстанні і распаўсюджванні культурных каштоўнасцей, эстэтычным выхаванні, мастацкай і культуралагічнай адукацыі, арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.3. Культурныя каштоўнасці - створаныя (пераўтвораныя) чалавекам або цесна звязаныя з яго дзейнасцю матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, якія маюць мастацкае, гістарычнае, навуковае або іншае значэнне;

1.4. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры - комплекс мер, якія прымаюцца дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь па захаванні, развіцці і распаўсюджванні культуры, арганізацыйным, прававым, фінансавым, матэрыяльна-тэхнічным, кадравым, інфармацыйным і іншым забеспячэнні культурнай дзейнасці.

1.5. Аб'екты культурнай інфраструктуры - будынкі, збудаванні, памяшканні і іншая нерухомая маёмасць, якія прызначаны (выкарыстоўваюцца) для ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці;

1.6. Арганізацыя культуры - юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе ў якасці асноўнай дзейнасці культурную дзейнасць;

1.7. Дзеячы культуры і мастацтва - работнікі культуры, творчыя работнікі, якія маюць ганаровыя званні ў галіне культуры;

1.8. Калектыў мастацкай творчасці - аб'яднанне фізічных асоб, якія сумесна займаюцца мастацкай творчасцю;

1.9. Манапалізм у культуры - дзеянні (бяздзеянне) суб'ектаў культурнай дзейнасці (за выключэннем фізічных асоб), якія супярэчаць гэтаму Закону, накіраваны на недапушчэнне, абмежаванне або ўстараненне канкурэнцыі і таксама наносяць шкоду правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзян у галіне культуры;

1.10. Мастацкая творчасць - стварэнне і (або) выкананне твораў мастацкай літаратуры і мастацтва;

1.11. Супрацоўнік культурніцкай сферы - фізічная асоба, якая знаходзіцца ў працоўных адносінах з арганізацыяй культуры на падставе заключанага працоўнага дагавора (кантракта) і займаецца культурнай дзейнасцю;

1.12. Рэлігія - светапогляд і светаадчуванне, а таксама адпаведныя ім паводзіны і спецыфічныя дзеянні (культ), заснаваныя на веры ў надзвычайнае;

1.13. Рэлігійныя абрады - комплекс прынятых веравызнаннем дзеянняў, у якіх увасабляюцца рэлігійныя ўяўленні;

1.14. Рэлігійныя рытуалы і цырымоніі - вызначаны веравызнаннем парадак выканання абрадавых дзеянняў;

1.15. Рэлігійны культ - галоўны накірунак рэлігійнай дзейнасці, які праяўляецца ў адпаведных паводзінах і спецыфічных дзеяннях, у якіх адлюстроўваецца рэлігійнае шанаванне надзвычайнага;

1.16. Паломніцтва - наведванне вернікамі гістарычна вядомых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мясцін (прошчаў) з мэтай шанавання святынь дадзенай рэлігіі;

1.17. Прошча - месца (крыніца, возера, камень, узгор'е і г.д.), надзеленае, паводле ўяўленняў вернікаў, незвычайнымі, надпрыроднымі сіламі і ўласцівасцямі;

1.18. Рэстытуцыя - вяртанне культурных каштоўнасцей, твораў мастацтва і архітэктуры, кніг, прадметаў археалогіі і гісторыі, рукапісаў і архіўных дакументаў, якія былі захоплены прымусова, незаконна ці ў адпаведнасці з незаконна заключанай дамовай, яе сапраўднаму ўладальніку;

1.19. Краязнаўства - усебаковае вывучэнне пэўнай тэрыторыі, раёна, населенага пункта мясцовым насельніцтвам, а таксама спецыялістамі навуковых устаноў;

1.20. Турызм - турыстычная вандроўка, а таксама дзейнасць юрыдычных і фізічных асобаў, у тым ліку і прыватных прадпрымальнікаў, па яе арганізацыі;

1.21. Турыст - фізічная асоба, якая знаходзіцца ў турыстычнай вандроўцы на перыяд больш за 24 гадзіны альбо мае не менш за адзін начлег у краіне (месцы) часовага знаходжання;

1.22. Турыстычная індустрыя - спалучэнне аб'ектаў для размяшчэння турыстаў, транспартных сродкаў, аб'ектаў грамадскага харчавання, аб'ектаў і сродкаў адпачынку і іншага прызначэння, якія выкарыстоўваюцца з мэтай задавальнення патрэбаў турыстаў, экскурсантаў і садзейнічаюць іх культурнаму развіццю і ўмацаванню здароўя;

1.23. Турыстычныя рэсурсы - сацыяльна-культурныя і прыродныя аб'екты, у тым ліку нерухомыя матэрыяльныя гістарычна-культурныя (у тым ліку і рэлігійныя) каштоўнасці, якія задавальняюць культурныя і духоўныя патрэбы турыстаў і экскурсантаў;

1.24. Экскурсант - фізічная асоба, якая ўдзельнічае ў экскурсіі без начлегу ў краіне (месцы) часовага знаходжання;

1.25. Экскурсійнае абслугоўванне - дзейнасць суб'ектаў турыстычнай сферы, а таксама іншых юрыдычных ці фізічных асобаў па падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні экскурсій;

1.26. Экскурсія - турыстычная вандроўка фізічных асобаў на працягу менш за 24 гадзіны, наведванне фізічнымі асобамі, у тым ліку турыстамі, з мэтамі пашырэння свайго кругагляду турыстычных аб'ектаў, якія маюць мастацкую, гістарычную і іншую вартасць, пад кіраўніцтвам экскурсавода альбо іншай асобы, якая мае права праводзіць экскурсіі;

1.27. Экскурсавод - фізічная асоба, якая мае адпаведную кваліфікацыю для правядзення экскурсій;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.28. Творчая дзейнасць - від дзейнасці, які ўключае мастацкую творчасць і іншую інтэлектуальную дзейнасць, што завяршаецца з'яўленнем новага, не існаваўшага раней самастойнага выніку інтэлектуальнай дзейнасці ў галіне культуры.

2. Змест асобных паняццяў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Законе, вызначаецца ў адпаведных артыкулах гэтага Закона.

## Артыкул 2. Заканадаўства аб культуры і яго дзеянне

1. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб культуры грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства, у тым ліку міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць грамадскія адносіны, звязаныя з ажыццяўленнем і забеспячэннем культурнай дзейнасці.

2. Калі міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца нормы міжнароднага дагавора.

3. Гэты Закон і іншыя акты заканадаўства аб культуры рэгулююць дзяржаўна-грамадскія адносіны ў наступных кірунках:

3.1. Ахова гістарычна-культурнай спадчыны;

3.2. Бібліятэчная справа;

3.3. Дзейнасць творчых саюзаў і творчых работнікаў;

3.4. Кінематаграфія;

3.5. Музейная справа;

3.6. Народнае мастацтва, народныя промыслы (рамёствы);

3.7. Гастрольна-канцэртная дзейнасць;

3.8. Выдавецкая справа ў частцы, звязанай з выданнем твораў літаратуры, якія маюць значэнне для захавання, развіцця і распаўсюджвання культуры, дзейнасць па распаўсюджванні і папулярызацыі ўказаных выданняў;

3.9. Дзейнасць па арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу, у тым ліку і турызму) насельніцтва;

3.10. Дзейнасць па стварэнні аб'ектаў культурнай інфраструктуры, вытворчасці (вырабе) інструментаў, абсталявання і іншай маёмасці, прызначаных для ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці;

3.11. Дзейнасць па эстэтычным выхаванні, мастацкай і культуралагічнай адукацыі;

3.12. Дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі ў частцы, звязанай са стварэннем, выкарыстаннем, распаўсюджваннем і папулярызацыяй культурных каштоўнасцей;

3.13. Мастацкая творчасць;

3.14. Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва;

3.15. Навукова-даследчая і метадычная дзейнасць у галіне культуры;

3.16. Прафесійная дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры;

3.17. Прафесійная дзейнасць у галіне мастацтва;

3.18. Асноўныя кірункі дзяржаўнай моўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь;

3.19. Фінансаванне культурніцкай дзейнасці;

3.20. Іншыя кірункі, звязаныя з ажыццяўленнем і забеспячэннем культурнай дзейнасці, калі іншае не вызначана гэтым Законам.

## Артыкул 3. Дзяржаўная палітыка і дзяржаўнае кіраванне ў галіне культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі напрамкамі публічнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляюцца:

- захаванне, развіццё і распаўсюджванне беларускай нацыянальнай культуры і мовы;
- садзейнічанне ў рэалізацыі правоў грамадзян у сферы культуры;
- забеспячэнне аховы гістарычна-культурнай і археалагічнай спадчыны;
- стварэнне дзяржаўных арганізацый культуры і садзейнічанне развіццю іх матэрыяльна-тэхнічнай базы;
- стварэнне ўмоў для супрацоўніцтва ў сферы культуры дзяржаўных органаў з камерцыйнымі і рэлігійнымі арганізацыямі, з індывідуальнымі прадпрымальнікамі;
- стварэнне ўмоў для развіцця юрыдычных асоб усіх форм уласнасці, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць, аказанне ім падтрымкі ў рэалізацыі культурных праектаў на конкурснай аснове;
- стварэнне ўмоў для прыцягнення сродкаў фундатараў і мецэнатаў культуры, іншых юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, для фінансавання культуры;
- распрацоўка і рэалізацыя дзяржаўных, рэгіянальных і галіновых праграм, накіраваных на захаванне і развіццё культуры;
- рэалізацыя дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у сферы культуры;
- стварэнне спрыяльных умоў для эстэтычнага выхавання насельніцтва;
- абарона грамадскай маралі, прадухіленне прапаганды парна-

графіі, гвалту, жорсткасці, алкаголю і наркотыкаў;

- арганізацыя, правядзенне і падтрымка фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў і распрацовак у сферы культуры, аказанне метадычнай дапамогі па ажыццяўленні культурнай дзейнасці арганізацыям культуры і іншым юрыдычным асобам, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць;

- забеспячэнне функцыянавання і развіцця культуры ў сельскай мясцовасці, у тым ліку шляхам рацыянальнага і аптымальнага размяшчэння арганізацый культуры і турызму з улікам развіцця асобных рэгіёнаў і галін вытворчасці;

- стварэнне аб'ектаў культурнай інфраструктуры;

- садзейнічанне інфарматызацыі ў сферы культуры;

- падтрымка таленавітай моладзі і стварэнне ўмоў для яе плённай дзейнасці;

- заахвочванне работнікаў культуры, творчых работнікаў, арганізацый культуры, спонсараў і мецэнатаў культуры, іншых юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўнеслі значны ўклад у захаванне, развіццё і распаўсюджванне культуры;

- сацыяльная абарона работнікаў культуры і творчых работнікаў;

- садзейнічанне міжнароднаму супрацоўніцтву ў сферы культуры;

- забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам свабоднага доступу да культурных каштоўнасцей і культурнай дзейнасці на льготных умовах для інвалідаў, ветэранаў Другой сусветнай вайны, вайскоўцаў тэрміновай службы, дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, асоб, якія атрымліваюць дашкольную, агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую спецыяльную адукацыю, а таксама асоб, якія маюць заслугі перад дзяржавай і народам;

- стварэнне ўмоў інвалідам і іншым фізічна аслабленым асобам для свабоднага доступу і карыстання арганізацыямі культуры, у тым ліку доступу да інфармацыйна-камунікацыйных рэсурсаў;

- спрыянне стварэнню, распаўсюджванню і папулярызацыі суб'ектамі культурнай дзейнасці культурных каштоўнасцей, культурных мерапрыемстваў і культурных праектаў, якія маюць высокамастацкае і высокамаральнае значэнне, у тым ліку шляхам размяшчэння сацыяльна-творчых заказаў і фінансавання дзяржаўных, рэгіянальных і галіновых праграм, накіраваных на захаванне і развіццё культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- папулярызацыя нацыянальных фільмаў і фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў, а таксама іншых фільмаў, якія маюць важнае сацыяльна-культурнае значэнне;

- дыферэнцыраванне падыходаў да фінансавання вытворчасці фільмаў у рамках сацыяльна-творчых заказаў у адпаведнасці з заканадаўствам;

- забеспячэнне даступнасці паслуг у сферы культуры і турызму і павышэнне іх якасці;

- стварэнне ўмоў для адраджэння і развіцця гістарычных традыцый народнай творчасці, заахвочванне культурнай дзейнасці юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, ва ўказанай сферы;

- садзейнічанне арганізацыі і (або) правядзенні культурных мерапрыемстваў, экспертыз, іншых формаў аб'ектыўнай і незалежнай ацэнкі вынікаў творчай дзейнасці, а таксама развіццю літаратурнай і мастацкай крытыкі;

- стварэнне дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, якія спецыялізуюцца на асвятленні культурнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь і замежных дзяржавах;

- стымуляванне публікацый або паведамленняў на тэмы, звязаныя з культурным жыццём, у сродках масавай інфармацыі;

- стымуляванне выдання твораў мастацкай літаратуры, якія маюць значэнне для захавання, развіцця і распаўсюджвання культуры (творы літаратуры нацыянальнай тэматыкі, для дзяцей і моладзі, класічныя творы мастацкай літаратуры і іншыя творы);

- рэстытуцыя і рэгуляванне ўвозу і (або) вывазу культурных каштоўнасцей, недапушчэнне незаконнага вывазу з Рэспублікі Беларусь культурных каштоўнасцей і незаконнай перадачы права ўласнасці на іх, прыняцце мер па вяртанні ў Рэспубліку Беларусь культурных каштоўнасцей, незаконна вывезеных з яе тэрыторыі або не вернутых ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку;

- падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў культуры.

## Артыкул 4. Адказнасць за парушэнне заканадаўства аб культуры

Заканадаўствам устанаўліваецца крымінальная, адміністрацыйная, дысцыплінарная, матэрыяльная і іншая адказнасць за парушэнне заканадаўства аб культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Артыкул 5. Суб'екты культурнай дзейнасці**

1. Суб'ектамі культурнай дзейнасці з'яўляюцца:

1.1. работнікі культуры, іншыя фізічныя асобы;

1.2. арганізацыі культуры;

1.3. суб'екты творчай дзейнасці:

- творчыя работнікі і іншыя фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць творчую дзейнасць;

- калектывы мастацкай творчасці;

1.4. органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання;

1.5. навукова-даследчыя ўстановы і ўстановы адукацыі ў галіне культуры;

1.6. іншыя юрыдычныя асобы (у тым ліку і рэлігійныя).

2. У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб культуры, суб'ектамі культурнай дзейнасці могуць выступаць падраздзяленні юрыдычных асоб, у тым ліку адасобленыя.

**Артыкул 6. Ажыццяўленне і забеспячэнне культурнай дзейнасці**

1. Суб'екты культурнай дзейнасці маюць права ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства ажыццяўляць і (або) забяспечваць культурную дзейнасць.

2. Асноўнымі прынцыпамі ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці з'яўляюцца:

2.1. свабода мастацкай творчасці і іншай творчай дзейнасці, самаразвіццё творчых працэсаў;

2.2. разнастайнасць напрамкаў, форм, жанраў і стыляў у творчай дзейнасці, недапушчальнасць манапалізму ў культуры і манапалізацыі культурнай дзейнасці;

2.3. прыярытэт развіцця беларускай нацыянальнай культуры і мовы;

2.4. агульнадаступнасць культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах;

2.5. роўнасць суб'ектаў культурнай дзейнасці перад законам, недапушчальнасць устанаўлення пераваг і прывілей у галіне культуры, якія супярэчаць закону;

2.6. арыентацыя на нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, культурныя каштоўнасці, якія носяць высокамастацкі і высокамаральны характар;

2.7. гуманістычная накіраванасць і ўзмацненне асобаснага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачатку ў культурнай дзейнасці;

2.8. павага да хрысціянскіх каштоўнасцей і традыцый як адной з найважнейшых крыніц беларускай культуры;

2.9. усямерная ахова, захаванне, рацыянальнае выкарыстанне і памнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны і інтэлектуальнай уласнасці ў галіне культуры;

2.10. свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

2.11. узаемадзеянне беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў і яе інтэграцыя ў сусветную культуру;

2.12. спалучэнне дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у арганізацыі культурнай дзейнасці і кіраванні ёю.

## Артыкул 7. Свабода творчай дзейнасці і яе ажыццяўленне

1. Свабода творчай дзейнасці складаецца з права выбару сфер, кірункаў (школ), формаў, прыёмаў і метадаў творчай дзейнасці, самастойнага вызначэння формы і зместу, жанру, мовы, стылю, годнасці і прызначэння твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, рэпертуару твораў, якія выконваюцца, мовы, стылю і манеры выканання.

2. Умяшанне дзяржаўных органаў (арганізацый), іх службовых асоб, юрыдычных і фізічных асоб у працэс стварэння і (або) выканання суб'ектамі творчай дзейнасці твораў мастацкай літаратуры і мастацтва (далей - творчы працэс) з мэтай вызначыць змест творчага працэсу і (або) уздзейнічаць на яго вынікі не дапускаецца.

3. Не з'яўляюцца ўмяшаннем у творчы працэс дзеянні, заснаваныя на дагаворы з суб'ектам творчай дзейнасці аб стварэнні і выкарыстанні вынікаў творчага працэсу.

4. Любое ўмяшанне ў творчы працэс суб'екта творчай дзейнасці можа быць абскарджана ў суд у адпаведнасці з заканадаўствам.

## Артыкул 8. Сацыяльна-творчыя заказы

1. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы маюць права размяшчаць у суб'ектаў культурнай дзейнасці з іх згоды сацыяльна-творчыя заказы з мэтай стымулявання творчага пошуку, падтрымкі таленавітых аўтараў і выканаўцаў, рашэння іншых сацыяльна-культурных задач.

2. Сацыяльна-творчы заказ - дагавор на стварэнне новых твораў мастацкай літаратуры, фільмаў, тэатральных пастановак і канцэр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тных праграм, іншых вынікаў творчай дзейнасці, арганізацыю і правядзенне выставак, фестываляў, аглядаў, конкурсаў, экскурсій, іншых культурных мерапрыемстваў, аказанне паслуг у галіне культуры.

3. Суб'екты культурнай дзейнасці, якія распаўсюджваюць і (або) папулярызуюць вынікі творчай дзейнасці, маюць права самастойна вызначаць рэпертуарную палітыку і змест культурных праграм, распаўсюджваць і (або) папулярызаваць творы мастацкай літаратуры і мастацтва, розныя па відах, кірунках (школах), форме і зместу, жанры, мове, стылі, папулярызаваць творчасць розных аўтараў, выканаўцаў і калектываў мастацкай творчасці.

4. Забараняюцца распаўсюджванне і (або) папулярызацыя твораў мастацкай літаратуры і мастацтва ў выпадках, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 7 гэтага Закона.

5. Парадак прыняцця рашэнняў аб забароне або абмежаванні апублікавання, публічнага выканання і паказу твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, абнародавання іх іншым спосабам, аб забароне або абмежаванні правядзення іншых культурных мерапрыемстваў у выпадках, прадугледжаных пунктам 2 артыкула 7 гэтага Закона, а таксама дзяржаўныя органы, упаўнаважаныя на прыняцце такіх рашэнняў, вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

6. Рашэнне дзяржаўнага органа, дзеянні ўказанага органа або яго службовай асобы, звязаныя з забаронай або абмежаваннем абнародавання твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, а таксама з забаронай або абмежаваннем правядзення культурных мерапрыемстваў, могуць быць абскарджаны ў суд у адпаведнасці з заканадаўствам.

7. Асаблівасці парадку распаўсюджвання і (або) папулярызацыі вынікаў творчай дзейнасці ў ходзе правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў устанаўліваюцца актамі заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў.

## Артыкул 9. Кірункі дзяржаўнага рэгулявання і кіравання ў галіне культуры

Дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў галіне культуры, у адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй:

- фарміруюць і рэалізуюць дзяржаўную палітыку ў галіне культуры ў адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі ажыццяўлення і забеспячэння культурнай дзейнасці і прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, вызначаюць агульную стратэгію сацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

льна-эканамічнага і навукова-тэхнічнага развіцця ва ўказанай галіне;

- распрацоўваюць і зацвярджаюць дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры, забяспечваюць іх выкананне;

- пры распрацоўцы дзяржаўных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, іншых дзяржаўных праграм улічваюць магчымасць уздзеяння вынікаў іх рэалізацыі на захаванне і развіццё культуры, а таксама ўздзеяння самой культуры на гэтыя вынікі;

- вызначаюць і перыядычна пераглядаюць дзяржаўныя мінімальныя сацыяльныя стандарты ў галіне культуры, забяспечваюць іх рэалізацыю;

- ствараюць дзяржаўныя арганізацыі культуры і кіруюць іх дзейнасцю, садзейнічаюць развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы дзяржаўных арганізацый культуры;

- ажыццяўляюць планаванне, забяспечваюць праектаванне і будаўніцтва (стварэнне) аб'ектаў культурнай інфраструктуры, неабходных для выканання дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, рэалізацыі дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры;

- забяспечваюць уключэнне ў праекты будаўніцтва грамадскіх і жылых будынкаў (комплексаў), забудовы жылых масіваў заданняў па іх мастацкім афармленні, а таксама спалучэнне архітэктурных рашэнняў новых збудаванняў з існуючай забудовай, прыродным ландшафтам з улікам ахоўных зон нерухомых матэрыяльных гісторычна-культурных каштоўнасцей, выкарыстанне нацыянальных традыцый і прыёмаў забудовы, ландшафтнай архітэктуры з мэтай фарміравання эстэтычнага жыццёвага асяроддзя;

- пры фарміраванні рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў на чарговы фінансавы год прадугледжваюць выдзяленне сродкаў на фінансаванне культурнай дзейнасці.

З мэтай стварэння арганізацыйных асноў узаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання ў галіне культуры і грамадскіх арганізацый (аб'яднанняў), якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць, дзеячаў культуры і мастацтва, іншых суб'ектаў культурнай дзейнасці пры дзяржаўных органах ствараюцца грамадскія рады і іншыя кансультатыўныя органы.

### Артыкул 10. Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры

1. Дзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры падзяляюцца на рэспубліканскія і рэгіянальныя.

2. Агульнадзяржаўныя праграмы захавання і развіцця культуры вызначаюць меры па захаванні, развіцці і распаўсюджванні культуры на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Рэгіянальныя праграмы захавання і развіцця культуры вызначаюць меры па захаванні, развіцці і распаўсюджванні культуры на ўзроўні адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь.

4. Рэспубліканскія праграмы захавання і развіцця культуры распрацоўваюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь не менш чым на пяць гадоў і зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

5. Рэгіянальныя праграмы захавання і развіцця культуры могуць распрацоўвацца па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Указаныя праграмы зацвярджаюцца адпаведнымі мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

## Раздзел 2

## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ГРАМАДЗЯН У ГАЛІНЕ КУЛЬТУРЫ

### Артыкул 11. Правы і абавязкі грамадзян Беларусі, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў галіне культуры

1. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь у галіне культуры маюць права на:

1.1. годны ўзровень культурнага жыцця;

1.2. атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб культурным жыцці;

1.3. удзел у культурным жыцці;

1.4. свабоду творчай дзейнасці;

1.5. захаванне і развіццё нацыянальных культурных традыцый;

1.6. ахову інтэлектуальнай уласнасці ў галіне культуры;

1.7. эстэтычнае выхаванне, мастацкую і культуралагічную адукацыю;

1.8. свабоду аб'яднанняў у галіне культуры;

1.9. стварэнне арганізацый культуры.

2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь у галіне культуры абавязаны:

2.1. берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну, беларускую мову і іншыя нацыянальныя культурныя каштоўнасці;

2.2. паважаць культуру і мову ўсіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

3. Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, абавязаны клапаціцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб эстэтычным выхаванні, культурным развіцці дзяцей, далучэнні іх да культурных каштоўнасцей.

4. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь карыстаюцца правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі ў галіне культуры нароўне з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі законамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

5. Грамадзяне маюць права на годны ўзровень забяспечанасці з улікам іх месца жыхарства агульнадаступнымі паслугамі ў галіне культуры, арганізацыямі культуры, якія аказваюць такія паслугі, аб'ектамі культурнай інфраструктуры, а таксама на якасны ўзровень распаўсюджваемых і папулярызуемых культурных каштоўнасцей і эстэтычнага жыццёвага асяроддзя.

**Артыкул 12. Права на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб культурным жыцці**

Грамадзянам гарантуецца права на атрыманне, захоўванне, распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб змесце культурніцкай дзейнасці, культурных каштоўнасцях і аб'ектах культурнай інфраструктуры.

**Артыкул 13. Права на ўдзел у культурным жыцці**

1. Грамадзяне прымаюць удзел у культурным жыцці шляхам удзелу ў культурнай дзейнасці, доступу (далучэння) да культурных каштоўнасцей і карыстання імі.

2. Права кожнага на ўдзел у культурнай дзейнасці прадугледжвае:

2.1. свабоду выбару сферы, віду, напрамку і формы культурнай дзейнасці ў адпаведнасці са сваімі патрэбнасцямі, інтарэсамі і здольнасцямі (магчымасцямі);

2.2. магчымасць самастойна ці сумесна з іншымі суб'ектамі культурнай дзейнасці ажыццяўляць выбраную культурную дзейнасць.

3. Права кожнага на доступ (далучэнне) да культурных каштоўнасцей і карыстанне імі прадугледжвае:

3.1. свабоду выбару віду культурных каштоўнасцей, якія цікавяць, а таксама формы далучэння да іх;

3.2. магчымасць наведвання арганізацый культуры, аб'ектаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай інфраструктуры, у тым ліку і рэлігійных, з мэтай азнаямлення з культурнымі каштоўнасцямі, іх вывучэння і засваення;

3.3. магчымасць далучэння да культурных каштоўнасцей з дапамогай інфармацыі, зафіксаванай на матэрыяльных носьбітах, а таксама аўдыё-, аўдыёвізуальных і іншых паведамленняў, якія распаўсюджваюцца сродкамі масавай інфармацыі;

3.4. магчымасць азнаямлення з культурнымі каштоўнасцямі, іх вывучэння і засваення шляхам непасрэднага ўспрымання;

3.5. магчымасць выкарыстання культурных каштоўнасцей у адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Права свабоднага доступу (далучэння) да культурных каштоўнасцей дзейнічае ў адносінах да:

4.1. матэрыяльных культурных каштоўнасцей, якія належаць дзяржаве, царкве і (або) знаходзяцца ў фондах арганізацый культуры, поўнасцю або часткова фінансуемых з рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў;

4.2. нематэрыяльных культурных каштоўнасцей, выключныя правы на выкарыстанне якіх належаць дзяржаве, арганізацыям культуры, якія поўнасцю або часткова фінансуюцца з рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, а таксама нематэрыяльных культурных каштоўнасцей, што перайшлі ў грамадскі набытак.

5. Умовы і парадак свабоднага доступу (далучэння) да культурных каштоўнасцей, указаных у пункце 4 гэтага артыкула, вызначаюцца гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

6. Права свабоднага доступу (далучэння) да культурных каштоўнасцей, указаных у пункце 4 гэтага артыкула, не выключае магчымасці ўстанаўлення заканадаўчымі актамі аб культуры або ў адпаведнасці з імі абмежаванняў, якія грунтуюцца на спецыфіцы культурных каштоўнасцей і (або) неабходнасці забеспячэння іх захавання.

7. Магчымасць доступу (далучэння) да культурных каштоўнасцей, не ўказаных у пункце 4 гэтага артыкула, а таксама ўмовы і парадак такога доступу вызначаюцца ўласнікам або ўладальнікам выключных правоў на культурныя каштоўнасці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 14. Права на захаванне і развіццё нацыянальных культурных традыцый

1. Грамадзяне, якія належаць да любой нацыянальнай супольнасці і пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць права захоўваць і развіваць сваю нацыянальную культуру, выхоўваць дзяцей у нацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальных культурных традыцыях, карыстацца роднай мовай.

2. Грамадзяне, якія належаць да любой нацыянальнай супольнасці, маюць права на стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь грамадскіх аб'яднанняў, што ажыццяўляюць культурную дзейнасць.

3. Грамадзяне без абмежаванняў узросту маюць права на выбар форм і спосабаў эстэтычнага выхавання, мастацкай і культуралагічнай адукацыі ў адпаведнасці з гэтым Законам і заканадаўствам аб адукацыі.

## Раздзел 3

## АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРЫ

### Артыкул 15. Віды і асноўныя тыпы арганізацый культуры

1. Арганізацыі культуры ў Рэспубліцы Беларусь па форме ўласнасці падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя, па асноўнай мэце дзейнасці - на камерцыйныя і некамерцыйныя.

2. Арганізацыі культуры падраздзяляюцца на наступныя асноўныя тыпы:

2.1. бібліятэкі;

2.2. музеі;

2.3. карцінныя, мастацкія галерэі і галерэі мастацтваў, выставачныя залы, панарамы і іншыя выставачныя арганізацыі ў галіне культуры;

2.4. клубы, палацы (дамы, цэнтры) культуры, цэнтры (дамы) народнай творчасці (народнага мастацтва, фальклору), цэнтры (дамы) рамёстваў, маладзёжныя культурныя цэнтры, цэнтры нацыянальных культур і іншыя клубныя ўстановы (далей - клубныя ўстановы);

2.5. паркі культуры і адпачынку, гарадскія сады, заапаркі, заасады (далей - паркі);

2.6. кніжныя палаты;

2.7. тэатры;

2.8. цыркі;

2.9. філармоніі і іншыя канцэртныя арганізацыі (далей - канцэртныя арганізацыі);

2.10. арганізацыі кінематаграфіі;

2.11. творчыя майстэрні;

2.12. арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў);

2.13. навукова-праектныя і вытворчыя рэстаўрацыйныя арганізацыі;

2.14. навукова-даследчыя установы і метадычныя цэнтры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы).

3. У Рэспубліцы Беларусь могуць ствараюцца арганізацыі культуры іншых тыпаў, у тым ліку змешаных.

3.1. Арганізацыі культуры, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць праз падрыхтоўку, арганізацыю, паказ і (або) правядзенне спектакляў, канцэртаў ці іншых публічных паказаў, лічацца тэатральна-відовішчнымі.

Да тэатральна-відовішчных арганізацый адносяцца тэатры, цыркі, канцэртныя арганізацыі, іншыя тыпы арганізацый культуры.

3.2. Арганізацыі культуры, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць праз забеспячэнне доступу фізічных асоб да культурных каштоўнасцей, што знаходзяцца ў фондах гэтых арганізацый, або праз стварэнне ўмоў для заняцця народнай і мастацкай творчасцю, самаадукацыяй, а таксама для духоўнага і фізічнага развіцця, лічацца культурна-асветнымі.

Да культурна-асветных арганізацый адносяцца музеі, бібліятэкі, клубныя ўстановы, іншыя тыпы арганізацый культуры, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць, указаную ў частцы першай гэтага пункта.

3.3. Арганізацыям культуры ў выпадках, вызначаных Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, можа быць прысвоены статус "нацыянальны".

Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення статусу "нацыянальны" і асаблівасці прававога становішча арганізацый культуры з такім статусам вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

4. Арганізацыйна-прававыя формы, асаблівасці прававога становішча і парадку дзейнасці асобных тыпаў арганізацый культуры вызначаюцца гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

5. Гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства аб культуры могуць быць прадугледжаны абавязковыя патрабаванні (умовы), пры выкананні якіх дапускаецца стварэнне арганізацый культуры пэўных відаў (тыпаў), у тым ліку патрабаванні да складу фондаў культурных каштоўнасцей, а таксама маёмасці, што перадаюцца заснавальнікам арганізацыі культуры для ажыццяўлення або забеспячэння культурнай дзейнасці.

**Артыкул 16. Асаблівасці ўстаноў культуры як адной з форм некамерцыйных арганізацый**

1. Установа культуры - арганізацыя, якая ствараецца для ажыццяўлення інфармацыйных, асветных, адукацыйных, выхаваўчых, за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

баўляльных і іншых функцый некамерцыйнага характару ў галіне культуры і фінансуецца поўнасцю або часткова яе заснавальнікам.

2. Установа культуры дзейнічае на падставе статута, зацверджанага заснавальнікам.

3. Непасрэднае кіраўніцтва ўстановай культуры ажыццяўляе кіраўнік, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам, а таксама іншыя органы кіравання, вызначаныя заканадаўствам і (або) статутам установы культуры. Заснавальнік заключае з кіраўніком установы культуры працоўны дагавор (кантракт) у адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Установа культуры валодае, карыстаецца і распараджаецца замацаванай за ёю маёмасцю на праве аператыўнага кіравання.

5. Заснавальнікі ўстаноў культуры абавязаны забяспечыць установы культуры будынкамі або памяшканнямі, тэхнічнымі і іншымі сродкамі, неабходнымі для ажыццяўлення асноўнай дзейнасці.

6. Перавод устаноў культуры ў іншыя памяшканні, якія пагаршаюць умовы іх дзейнасці, не дапускаецца.

### Артыкул 17. Стварэнне, дзяржаўная рэгістрацыя, рэарганізацыя і ліквідацыя арганізацый культуры

1. Парадак стварэння, дзяржаўнай рэгістрацыі, рэарганізацыі і ліквідацыі арганізацый культуры вызначаецца Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. У кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы Рэспублікі Беларусь Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, органамі мясцовага самакіравання прымаюцца меры па стымуляванні стварэння арганізацый культуры, якія гарантуюць задавальненне асноўных духоўных патрэбнасцей насельніцтва.

3. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы маюць права ствараць дзяржаўныя арганізацыі культуры любых тыпаў звыш нарматываў, вызначаных дзяржаўнымі мінімальнымі сацыяльнымі стандартамі ў галіне культуры.

4. Пры планаванні стварэння дзяржаўных арганізацый культуры ўлічваюцца гістарычныя, нацыянальныя і геаграфічныя асаблівасці мясцовасці.

5. Ліквідацыя дзяржаўных устаноў культуры не дапускаецца, калі такая ліквідацыя выкліча немагчымасць выканання дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры.

6. Рэарганізацыя і ліквідацыя дзяржаўных устаноў культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія маюць асабліваае значэнне для захавання, развіцця і распаўсюджвання беларускай нацыянальнай культуры, ажыццяўляюцца са згоды Урада Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел 4

## ТВОРЧЫЯ САЮЗЫ І КАЛЕКТЫВЫ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ ЯК СУБ'ЕКТЫ МАСТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Артыкул 18. Творчыя саюзы і іх профілі

Творчы саюз - добраахвотнае грамадскае аб'яднанне творчых работнікаў (не менш чым дзве трэці ад агульнага ліку членаў) і іншых грамадзян, якія ўнеслі ўклад у развіццё культуры, створанае на аснове агульнасці інтарэсаў яго членаў у пэўным відзе творчай дзейнасці для задавальнення іх духоўных або іншых нематэрыяльных патрэбнасцей і дасягнення статутных мэт.

Стварэнне, дзяржаўная рэгістрацыя, дзейнасць, рэарганізацыя і ліквідацыя творчых саюзаў ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб грамадскіх аб'яднаннях з улікам асаблівасцей, устаноўленых гэтым Кодэксам.

Творчыя саюзы незалежныя ў сваёй дзейнасці ад палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў.

Дзяржаўныя органы забяспечваюць захаванне і абарону правоў і законных інтарэсаў творчых саюзаў, гарантуюць аднолькавыя ўмовы для выканання імі статутных мэт і задач.

Творчыя саюзы падзяляюцца на асобныя арганізацыі ў адпаведнасці з профілем сваёй дзейнасці.

### Артыкул 19. Правы творчых саюзаў і іх уласнасць

1. Для ажыццяўлення агульнанацыянальных задач развіцця культуры, падтрымкі і развіцця талентаў творчыя саюзы маюць права:

1.1. звяртацца ў дзяржаўныя органы з прапановамі па пытаннях развіцця культуры, а таксама сацыяльна-прававой абароны творчых работнікаў;

1.2. атрымліваць ад дзяржаўных органаў інфармацыю аб распрацоўцы і прыняцці нарматыўных прававых актаў у сферы культуры, абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў творчых работнікаў і творчых саюзаў;

1.3. свабодна распаўсюджваць інфармацыю аб сваёй дзейнасці і з гэтай мэтай засноўваць уласныя сродкі масавай інфармацыі, а так-

сама карыстацца ва ўстаноўленым парадку дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі;

1.4. абараняць уласныя правы, а таксама (па асабістых даручэннях) аўтарскія, сумежныя, іншыя правы і ахоўваемыя законам інтарэсы сваіх членаў перад дзяржаўнымі органамі і наймальнікамі;

1.5. ствараць юрыдычныя службы і выкарыстоўваць іншыя формы прававой абароны;

1.6. прадастаўляць бязвыплатную (спонсарскую) дапамогу ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

1.7. ажыццяўляць дзейнасць па кіраванні маёмаснымі правамі аўтараў або іншых праваўладальнікаў на калектыўнай аснове ў парадку, вызначаным заканадаўствам.

2. Два і больш творчыя саюзы могуць ствараць асацыяцыю (саюз) творчых саюзаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

3. Творчыя саюзы ў адпаведнасці з іх статутамі могуць уступаць у міжнародныя творчыя аб'яднанні, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні і ажыццяўляць іншыя дзеянні, калі яны не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязацельствам.

4. Творчыя саюзы могуць мець ва ўласнасці любую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння дзейнасці, прадугледжанай іх статутамі, за выключэннем аб'ектаў, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

5. Уласнікам маёмасці творчага саюза з'яўляецца творчы саюз.

6. Члены творчых саюзаў страчваюць правы на маёмасць, якая была перададзена імі ва ўласнасць творчага саюза, у тым ліку на членскія ўзносы. Яны не адказваюць па абавязацельствах творчых саюзаў, членамі якіх яны з'яўляюцца, а творчыя саюзы не адказваюць па абавязацельствах сваіх членаў.

7. У выпадку ліквідацыі творчага саюза яго маёмасць, якая засталася пасля задавальнення патрабаванняў крэдытораў, выкарыстоўваецца ў мэтах, вызначаных статутам творчага саюза.

8. Грашовыя сродкі і іншая маёмасць творчых саюзаў не могуць пераразмяркоўвацца паміж членамі гэтых саюзаў і выкарыстоўваюцца толькі для выканання статутных мэт і задач, вызначаных статутам творчага саюза.

## Артыкул 20. Віды, жанры і формы калектываў мастацкай творчасці

1. Калектывы мастацкай творчасці могуць стварацца ў выглядзе:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.1. прафесійных калектываў мастацкай творчасці (далей - прафесійны калектыў);

1.2. непрафесійных (аматарскіх) калектываў мастацкай творчасці (далей - аматарскі калектыў);

1.3. аўтэнтычных фальклорных калектываў мастацкай творчасці (далей - фальклорны калектыў).

2. Прафесійным калектывам прызнаецца калектыў, што складаецца з фізічных асоб, якія сумесна займаюцца мастацкай творчасцю на прафесійнай аснове (як правіла, у якасці асноўнага занятку, што прыносіць даход).

3. Аматарскім калектывам прызнаецца калектыў, што складаецца з фізічных асоб, якія сумесна займаюцца мастацкай творчасцю, як правіла, на грамадскіх пачатках, за выключэннем кіраўніка аматарскага калектыву, які працуе на прафесійнай аснове. Статус аматарскага калектыву пацвярджаецца пашпартам аматарскага калектыву, які выдаецца Міністэрствам культуры Беларусі.

4. Фальклорным калектывам прызнаецца калектыў, што складаецца з фізічных асоб, звязаных натуральным фальклорным асяроддзем канкрэтнай мясцовасці, якія атрымалі і перадаюць фальклорныя веды і навыкі ў парадку вуснай традыцыі, сумесна займаюцца мастацкай творчасцю на аснове самаарганізацыі і самакіравання. Прававое становішча фальклорнага калектыву вызначаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

5. У Рэспубліцы Беларусь могуць ствараіца калектывы мастацкай творчасці, розныя па жанрах (тэатральныя, вакальна-харавыя, харэаграфічныя, музычна-інструментальныя, дэкаратыўна-прыкладныя, выяўленчыя, цыркавыя і інш.) і формах (хор, ансамбль, аркестр, студыя і інш.).

## Артыкул 21. Стварэнне і статус прафесійных і аматарскіх калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры

1.Заснавальнікам прафесійнага або аматарскага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, можа выступаць юрыдычная асоба, у структуры якой ствараецца гэты калектыў.

2. Парадак стварэння прафесійнага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, вызначаецца заснавальнікам гэтага калектыву.

3. Асаблівасці стварэння аматарскіх калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры, у дзяржаўных клубных установах могуць устанаўлівацца заканадаўствам аб культуры і (або) статутам (палажэннем) адпаведнай клубнай установы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Удзельнікі прафесійнага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, ажыццяўляюць сваю дзейнасць на аснове ўдзелу (членства) у юрыдычнай асобе, якая выступае заснавальнікам прафесійнага калектыву, ці на падставе працоўнага або грамадзянска-прававога дагавора (кантракта), заключанага з заснавальнікам прафесійнага калектыву ў адпаведнасці з заканадаўствам.

5. Удзельнікі аматарскага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, ажыццяўляюць сваю дзейнасць на аснове ўдзелу (членства) у юрыдычнай асобе, якая выступае заснавальнікам аматарскага калектыву, або прыёму (запісу) у аматарскі калектыў, што праводзіцца на аснове добраахвотнага волевыяўлення фізічнай асобы, у тым ліку па выніках папярэдняга адбору (конкурсу).

6. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, удзельнікі аматарскага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, маюць права на атрыманне ад заснавальніка аматарскага калектыву ўзнагароды, а таксама кампенсацыі расходаў, звязаных з ажыццяўленнем імі культурнай дзейнасці.

7. Кіраванне ў прафесійным або аматарскім калектыве, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, ажыццяўляецца заснавальнікам і кіраўніком калектыву ў адпаведнасці з заканадаўствам, установчымі дакументамі (дакументамі, што вызначаюць статус) заснавальніка калектыву, а ў прафесійным калектыве - і палажэннем аб ім.

8. Кіраўнік прафесійнага або аматарскага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады заснавальнікам калектыву. Кіраўнік калектыву нясе адказнасць за дзейнасць калектыву перад заснавальнікам.

9. Формай самакіравання ў прафесійным або аматарскім калектыве, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, выступае мастацкі савет, што складаецца з удзельнікаў гэтага калектыву.

**Артыкул 22. Правы прафесійнага і аматарскага калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры**

1. Прафесійны і аматарскі калектывы, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры, маюць права:

1.1. самастойна вызначаць рэпертуарную палітыку і змест культурных праграм, калі іншае не ўстаноўлена палажэннем аб прафесійным калектыве;

1.2. ажыццяўляць навучальна-творчую, рэпетыцыйную і іншую дзейнасць, накіраваную на падрыхтоўку канцэртаў, спектакляў і іншых публічных паказаў, выставак, іншых культурных мерапрыем-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стваў;

1.3. ажыццяўляць тэатральную, канцэртную і выставачную дзейнасць, удзельнічаць у фестывалях, аглядах, конкурсах і іншых культурных мерапрыемствах;

1.4. удзельнічаць у выкананні сацыяльна-творчых заказаў.

2. Усе здзелкі і іншыя юрыдычныя дзеянні, накіраваныя на рэалізацыю і абарону правоў, указаных у пункце 1 гэтага артыкула, а таксама іншых правоў, прадастаўленых прафесійнаму або аматарскаму калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, як суб'екту культурнай дзейнасці ў адпаведнасці з гэтым Законам, ажыццяўляюцца заснавальнікам калектыву па прадстаўленню яго кіраўніка.

3. Адказнасць за дзейнасць прафесійнага або аматарскага калектыву, які не з'яўляецца арганізацыяй культуры, перад дзяржавай, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі нясе яго заснавальнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Артыкул 23. Катэгорыі прафесійных і аматарскіх калектываў Рэспублікі Беларусь

Прафесійныя і аматарскія калектывы могуць быць "заслужанымі", "народнымі" (узорнымі) і " акадэмічнымі".

1. Прафесійным і аматарскім калектывам, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры і маюць адметныя дасягненні ў галіне мастацтва на працягу 10 гадоў, могуць быць прысвоены званні "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь" і "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

1.1. Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння і пазбаўлення прафесійнага калектыву звання "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь", аматарскага калектыву звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь", асаблівасці іх прававога становішча вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

2. Пастаянна дзеючым аматарскім калектывам пры наяўнасці адпаведнага мастацкага ўзроўню і творчых паказчыкаў, прадугледжаных Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, можа быць прысвоена найменне "народны" ("узорны").

2.1. Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення наймення "народны" ("узорны"), асаблівасці прававога становішча аматарскага калектыву з такім найменнем вызначаюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

3. Прафесійным калектывам, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай культуры і мастацтва, можа быць прысвоены статус "акадэмічны".

3.1. Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення статусу "акадэмічны" і асаблівасці прававога становішча прафесійных калектываў з такім статусам вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел 5

## КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

### Артыкул 24. Гістарычна-культурныя каштоўнасці

Ідэнтыфікацыя, ахова, зберажэнне, вяртанне, папулярызацыя і перадача нашчадкам гістарычна-культурнай спадчыны з'яўляецца святым абавязкам дзяржавы, справай гонару кожнага яе грамадзяніна.

Рэспубліка Беларусь лічыць прычыненне шкоды гістарычна-культурнай спадчыне злачынствам супраць агульначалавечых каштоўнасцей і грамадскага прагрэсу і бярэ на сябе абавязкі яе ахоўваць.

Гістарычна-культурнай спадчынай з'яўляецца сукупнасць адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гістарычна-культурных каштоўнасцях.

Гістарычна-культурныя каштоўнасці - гэта найбольш адметныя матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праяўленні чалавечай творчасці, якія маюць выдатныя духоўныя, эстэтычныя і дакументальныя вартасці і ўзяты пад ахову дзяржавы ў парадку, вызначаным дадзеным Законам.

### Артыкул 25. Віды культурных каштоўнасцей

Культурныя каштоўнасці падзяляюцца на наступныя віды:

1) матэрыяльныя каштоўнасці, матэрыяльнае ўвасабленне якіх не складае іх сутнасці;

2) духоўныя каштоўнасці, магчымае матэрыяльнае ўвасабленне якіх не аказвае істотнага ўплыву на іх сутнасць.

Матэрыяльныя каштоўнасці падзяляюцца на наступныя падвіды:

1а) нерухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, перамяшчэнне якіх у прасторы звязана з ажыццяўленнем шэрагу інжынерных мерапрыемстваў і вядзе да частковай або поўнай страты імі адметных каштоўных вартасцей;

1б) рухомыя матэрыяльныя каштоўнасці, перамяшчэнне якіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у прасторы не звязана са зменамі іх сутнасці і тэхнічнага стану.

Духоўныя каштоўнасці падзяляюцца на наступныя падвіды:

2а) фіксаваныя духоўныя каштоўнасці, сутнасць якіх можа быць поўнасцю зафіксавана і не залежыць ад далейшага лёсу іх стваральнікаў;

2б) увасобленыя духоўныя каштоўнасці, сутнасць або адметныя каштоўныя вартасці якіх поўнасцю ці часткова страчваюцца са знікненнем іх стваральнікаў, носьбітаў або зменаю сацыяльных умоў іх існавання.

## Артыкул 26. Класіфікацыя гістарычна-культурных каштоўнасцей

1. Гістарычна-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на катэгорыі ў адпаведнасці са звесткамі аб іх асаблівасцях, адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцях і ў залежнасці ад іх гістарычна-культурнай значнасці.

2. Матэрыяльныя гістарычна-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на наступныя катэгорыі:

2.1. Катэгорыя "0" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія ўключаны або прапанаваны для ўключэння ва ўстаноўленым парадку ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны або Спіс сусветнай спадчыны, што знаходзіцца пад пагрозай;

2.2. Катэгорыя "1" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія маюць міжнародную значнасць;

2.3. Катэгорыя "2" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія маюць нацыянальную значнасць;

2.4. Катэгорыя "3" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія маюць значнасць для асобных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь.

3. Нематэрыяльныя гістарычна-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на наступныя катэгорыі:

3.1. Катэгорыя "А" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, поўная аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя;

3.2. Катэгорыя "Б" - гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова адноўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці аб'ектыўна з часам могуць змяняцца.

4. Катэгорыі надаюцца:

4.1. матэрыяльным гістарычна-культурным каштоўнасцям, якія маюць значнасць для асобнага рэгіёна, абласнымі (Мінскім гарадскім) выканаўчымі камітэтамі, якія надалі статус гістарычна-культурнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасці;

4.2. іншым гістарычна-культурным каштоўнасцям Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

5. Наданне гістарычна-культурным каштоўнасцям катэгорыі ажыццяўляецца на падставе рашэнняў абласных (Мінскага гарадскога) саветаў па пытаннях гістарычна-культурнай спадчыны аб неабходнасці аднясення гістарычна-культурнай каштоўнасці да пэўнай катэгорыі.

Копія рашэння выканаўчага органа мясцовага самакіравання аб наданні катэгорыі матэрыяльнай гістарычна-культурнай каштоўнасці, якая мае значнасць для асобнага рэгіёна, накіроўваецца ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь або ў адрас юрыдычнай асобы, ім упаўнаважанай, для ўключэння звестак аб матэрыяльнай гістарычна-культурнай каштоўнасці, якая мае значнасць для асобнага рэгіёна, у Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

6. Культурныя каштоўнасці, якія ўваходзяць у склад комплексу матэрыяльных гістарычна-культурных каштоўнасцей, але якім асобна не нададзены статус гістарычна-культурнай каштоўнасці, лічацца матэрыяльнымі гістарычна-культурнымі каштоўнасцямі без катэгорыі.

7. Рашэнне аб змяненні катэгорыі гістарычна-культурнай каштоўнасці прымаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь на падставе рашэння Рады аб неабходнасці змянення яе катэгорыі.

## Артыкул 27. Улік і ахова гістарычна-культурнай спадчыны

Улік гістарычна-культурнай спадчыны - гэта сістэма мерапрыемстваў, накіраваных на:

1) вывучэнне гістарычна-культурнай спадчыны;

2) выяўленне найбольш адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі і іх дакументальную навуковую фіксацыю;

3) навуковую і мастацкую ацэнку выяўленых і прапанаваных да надання статусу каштоўнасці матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці;

4) наданне статусу каштоўнасці найбольш адметным вынікам і сведчанням гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі;

5) складанне пераліку матэрыяльных аб'ектаў і нематэрыяльных праяўленняў чалавечай творчасці, уласныя вартасці якіх неда-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

статковыя для надання ім статусу каштоўнасці.

Ахова гістарычна-культурнай спадчыны - гэта сістэма арганізацыйных, прававых і эканамічных мер па зберажэнні каштоўнасцей ад:

1) знішчэння або пагрозы знішчэння;
2) знікнення або пагрозы знікнення;
3) прычынення або пагрозы прычынення шкоды;
4) пагаршэння або пагрозы пагаршэння тэхнічнага стану;
5) навукова неабгрунтаваных змен (уключаючы асяроддзе);
6) пагаршэння ўмоў успрымання.

## Артыкул 28. Спецыялізаваны дзяржаўны орган аховы гістарычна-культурнай спадчыны

Спецыялізаваным дзяржаўным органам аховы гістарычна-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца Дзяржаўная інспекцыя Рэспублікі Беларусь па ахове гістарычна-культурнай спадчыны (далей ДзІнАС).

У сваёй дзейнасці ДзІнАС кіруецца палажэннем, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні і ўказанні ДзІнАС у межах яе кампетэнцыі абавязковыя для выканання ўсімі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі незалежна ад формы ўласнасці, ведамаснай падпарадкаванасці, дзяржаўнай прыналежнасці і грамадзянства.

У кампетэнцыю ДзІнАС уваходзіць вырашэнне ўсяго комплексу пытанняў, звязаных:

1) са зберажэннем каштоўнасцей, іх асяроддзя і ўмоў існавання;

2) з недапушчэннем страты адметных вартасцей каштоўнасцей, іх навукова неабгрунтаваных змен;

3) кантролем за практычным выкарыстаннем каштоўнасцей;

4) вывучэннем гістарычна-культурнай спадчыны, выяўленнем і ўлікам каштоўнасцей;

5) вяртаннем у Рэспубліку Беларусь каштоўнасцей Беларусі, якія апынуліся па-за яе межамі;

6) кантролем за безумоўным выкананнем патрабаванняў дадзенага Закона.

ДзІнАС узначальвае Старшыня, які назначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

ДзІнАС забараняецца праводзіць усякую камерцыйную і іншую дзейнасць, звязаную з атрыманнем прыбытку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Артыкул 29. Навукова-метадычная палітыка ў галіне ўліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання, памнажэння і вяртання гістарычна-культурнай спадчыны

Выпрацоўку і ўдасканаленне навукова-метадычнай палітыкі ў галіне ўліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання, памнажэння і вяртання гістарычна-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада (Навукова-метадычная рада) па пытаннях гістарычна-культурнай спадчыны пры ДзІнАС.

Фарміраванне персанальнага складу Навукова-метадычнай рады праводзіцца на пазаштатнай аснове.

Статут Навукова- метадычнай рады зацвярджаецца ДзІнАС.

Дзейнасць ДзІнАС і Навукова-метадычнай рады ажыццяўляецца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту і іншых крыніц фінансавання.

## Артыкул 30. Крытэрыі адбору каштоўнасцей

Навукова-метадычная рада пры разглядзе прадстаўленых прапаноў кіруецца тым, што ў Рэспубліцы Беларусь каштоўнасці павінны мець свае мастацкія, духоўныя або дакументальныя вартасці і адпавядаць хаця б аднаму з пералічаных крытэрыяў:

1) з'яўляцца:

- адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту;
- рэдкім або каштоўным сведчаннем існавання знікшай цывілізацыі;
- створаным або істотна пераасэнсаваным і перайначаным народам Беларусі эпічным творам;
- створаным на тэрыторыі Беларусі або пад уплывам беларускай гісторыі, рэчаіснасці, менталітэту, асяроддзя і г.д. адметным аўтарскім творам мастацтва;
- адметнай, характэрнай для Беларусі або аднаго з яе рэгіёнаў традыцыяй ці народным промыслам;
- сімвалам або іншым выражэннем ці абазначэннем з'яў, падзей або паняццяў, звязаных з гісторыяй Беларусі, яе асобных рэгіёнаў, радаводаў або этнічных груп;
- дакументальнай фіксацыяй адметных для свету і Беларусі падзей або працэсаў;
- адметным мастацкім творам, шэдэўрам творчага генія;
- выдатным або арыгінальным вынікам творчага або навукова-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічнага эксперыменту;

- рэдкім на тэрыторыі Беларусі або выдатным прыкладам дасягненняў гістарычна-культурнай дзейнасці іншага народа;

- вынікам або сведчаннем недаследаваных працэсаў;

- матэрыяльным аб'ектам або нематэрыяльнай з'явай, характэрнай толькі для культуры народа Беларусі;

- пахаваннем славутага чалавека, брацкай магілай воінаў і ахвяр ваенных падзей, узброеных канфліктаў і масавых рэпрэсій;

- традыцыйнай тапанімічнай назвай;

- рэдкім або выдатным узорам:

а) створанага чалавекам асяроддзя жыццядзейнасці;

б) пабудовы або іншага стварэння канкрэтнага гістарычнага перыяду, рэгіёну або тыпалагічнай прыналежнасці;

в) вырашэння вытворчых, гаспадарчых, фартыфікацыйных, арганізацыйных і іншых практычных пытанняў;

г) выкарыстання ў жыццядзейнасці чалавека прыродных фактараў і асаблівасцей;

д) прадметаў быту або іншага прызначэння пэўнага гістарычнага перыяду або рэгіёна;

е) пэўнага стылістычнага кірунку або рэгіянальнай ці этнічнай асаблівасці ў любым відзе мастацтва;

ж) твора любога віду народнага мастацтва пэўнага гістарычнага перыяду, рэгіёна або этнічнай групы;

2) быць непасрэдна звязанымі з:

- падзеямі або ідэямі і перакананнямі. якія аказалі значны ўплыў на ход гістарычнага развіцця сусвету і шматнацыянальнага народа Беларусі;

- жыццём і дзейнасцю выдатных асоб свету і Беларусі;

3) лічыцца звязанымі з:

- народнымі паданнямі, легендамі, іншымі эпічнымі творамі, народнымі абрадамі;

- матэрыяльным аб'ектам, надзеленым выдатнымі звышнатуральнымі ўласцівасцямі;

4) аказваць значны ўплыў на развіццё мастацтва, духоўнасці грамадства, светапогляду людзей у пэўны перыяд часу або на тэрыторыі аднаго з рэгіёнаў Беларусі;

5) утрымліваць недаследаваны або не поўнасцю даследаваны археалагічны культурны пласт.

Матэрыяльнымі гістарычна-культурнымі каштоўнасцямі могуць з'яўляцца толькі аўтэнтычныя або рэстаўрыраваныя паводле



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова абгрунтаванай праектнай дакументацыі аб'екты. Выключэнне з гэтага правіла можа дапускацца толькі ў адносінах да нерухомых аб'ектаў, якія поўнасцю ці амаль поўнасцю адноўлены паводле дакладных гістарычных даных на ранейшым месцы.

## Артыкул 31. Наданне статусу гістарычна-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь

Статус гістарычна-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь надаецца ДзІнАС найбольш адметным вынікам і сведчанням гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі.

Наданне гэтага статусу з'яўляецца магчымым і абавязковым пры наступных дзвюх умовах:

1) станоўчым заключэнні па дадзенаму аб'екту або праяўленню Навукова-метадычнай рады;

2) адсутнасці бясспрэчных дакументальна даведзеных звестак аб страце, знішчэнні або знікненні разглядаемага аб'екта ці праяўлення.

Пры адпаведнасці гэтым умовам статус каштоўнасці можа быць нададзены найбольш адметным вынікам і сведчанням гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, якія афіцыйна лічацца гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі ў іншых краінах.

Актам прызнання матэрыяльнага аб'екта або нематэрыяльнага праяўлення чалавечай творчасці каштоўнасцю з'яўляецца яго ўключэнне ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

## Артыкул 32. Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

1. Культурныя каштоўнасці, якім нададзены статус гістарычна-культурнай каштоўнасці, уключаюцца ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

2. Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь з'яўляецца асноўным дакументам дзяржаўнага ўліку гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і рэгіструецца ў Дзяржаўным рэгістры інфармацыйных рэсурсаў.

3. Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь змяшчае наступныя раздзелы:

3.1. Гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

3.2. Гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія згодна з заканадаўствам знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб гістарычна-культурных каштоўнасцях, якія пры дакументальна пацверджаным беларускім паходжанні апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь у парадку, што адпавядае нормам міжнароднага права, а таксама звесткі аб нематэрыяльных гістарычна-культурных каштоўнасцях, носьбіты якіх пры бясспрэчным (у тым ліку прызнаным імі самімі) беларускім паходжанні (нацыянальнасці) не маюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

3.3. Гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія незаконна знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб гістарычна-культурных каштоўнасцях, якія ў парушэнне норм міжнароднага права пры дакументальна пацверджаным беларускім паходжанні апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь;

3.4. Гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія зніклі ці страчаны пры нявысветленых абставінах. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб гістарычна-культурных каштоўнасцях, наяўнасць якіх дакументальна засведчана, пры ўмове адсутнасці бясспрэчных дакументальных звестак аб знішчэнні гэтых гістарычна-культурных каштоўнасцей;

3.5. Гістарычна-культурныя каштоўнасці, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, страты ці знікнення. У гэты раздзел уносяцца звесткі аб гістарычна-культурных каштоўнасцях, якія знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, страты або знікнення, з указаннем прычын, што выклікаюць пагрозу, і мер, неабходных для захавання гэтых гістарычна-культурных каштоўнасцей.

4. Звесткі аб гістарычна-культурных каштоўнасцях размяшчаюцца ў раздзелах Дзяржаўнага спіса гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь па відах гістарычна-культурных каштоўнасцей.

5. Пры ўключэнні комплексу гістарычна-культурных каштоўнасцей у Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у гэты спіс уключаецца таксама кожная з гістарычна-культурных каштоўнасцей, якая ўваходзіць у склад комплексу гістарычна-культурных каштоўнасцей.

6. Вядзенне Дзяржаўнага спіса гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь або юрыдычнай асобай, ім упаўнаважанай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Артыкул 33. Рэстытуцыя гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

Рэстытуцыя прадугледжвае вяртанне культурных каштоўнасцей, вывезеных з Рэспублікі Беларусь з парушэннем актаў заканадаўства, міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічалі ў Рэспубліцы Беларусь на момант іх вывазу, і іншых норм міжнароднага права, а таксама часова вывезеныя з Рэспублікі Беларусь у эвакуацыю ў час узброеных канфліктаў або на іншай падставе і не вернутыя ў Рэспубліку Беларусь без законных падстаў.

1. У мэтах арганізацыі дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь дзейнічае Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь.

2. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца пастаянна дзеючым дарадчым органам.

3. Асноўнымі задачамі Камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца:

3.1. вызначэнне прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь кірункаў дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей;

3.2. выпрацоўка прапаноў, рэкамендацый па комплексе пытанняў выяўлення, вяртання, сумеснага выкарыстання і ўвядзення ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей.

4. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, выконвае наступныя функцыі:

4.1. забяспечвае ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку камісіі "Вяртанне" пры грамадскім аб'яднанні "Беларускі фонд культуры", юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія дзейнічаюць у мэтах выяўлення, захавання і памнажэння гістарычна-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь;

4.2. супрацоўнічае з нацыянальнымі і міжнароднымі органамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і арганізацыямі, дзейнасць якіх звязана з вяртаннем культурных каштоўнасцей;

4.3. спрыяе ажыццяўленню мерапрыемстваў па вяртанні культурных каштоўнасцей;

4.4. ажыццяўляе кантроль за працэсам вяртання культурных каштоўнасцей;

4.5. абмяркоўвае праекты нарматыўных прававых актаў, іншых дакументаў, якія адносяцца да выяўлення, вяртання, суменага выкарыстання і ўвядзення ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, дае па іх рэкамендацыі;

4.6. уносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб фінансаванні дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей.

5. Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права:

5.1. уносіць у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб асноўных напрамках і формах дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей;

5.2. звяртацца да дзяржаўных органаў і іншых юрыдычных асоб па пытаннях падрыхтоўкі прапаноў у адпаведнасці з яе кампетэнцыяй;

5.3. заслухоўваць на сваіх пасяджэннях паведамленні рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых юрыдычных асоб аб пытаннях, якія адносяцца да яе дзейнасці;

5.4. атрымліваць ад рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых юрыдычных асоб неабходную інфармацыю і матэрыялы па пытаннях, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю;

5.5. далучаць ва ўстаноўленым парадку да яе работы работнікаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

6. Склад Камісіі па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Рэспублікі Беларусь, зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 34. Банк звестак аб гістарычна-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь

Для захавання і сістэматызацыі ўліковых дакументаў па каштоўнасцях, звестак аб адметных выніках і сведчаннях гістарычнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця народа Беларусі, страчаных матэрыяльных аб'ектах і нематэрыяльных праяўленнях чалавечай творчасці, якія маглі б атрымаць статус гістарычна-культурных каштоўнасцей у Рэспубліцы Беларусь, ствараецца Банк звестак аб гістарычна-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь (далей - банк звестак).

Банк звестак з'яўляецца дзяржаўнай установай з правамі юрыдычнай асобы і ствараецца пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Банк звестак праводзіць таксама работу па зборы, сістэматызацыі і захаванні ўсіх навукова-даследчых, выдавецкіх і рабочных матэрыялаў, звязаных з каштоўнасцямі.

Для гэтага:

1) уладальнікі і карыстальнікі каштоўнасцей павінны ў абавязковым парадку бясплатна перадаваць у банк звестак па аднаму экзэмпляру падрыхтаванай па іх заказу навукова-даследчай і праектнай дакументацыі на ўсе віды работ, па каштоўнасцях і ў зонах іх аховы ў выглядзе электроннай версіі;

2) рэспубліканскія выдавецкія арганізацыі павінны бясплатна перадаваць у банк звестак абавязковы экзэмпляр усіх выданняў, у якіх разглядаюцца пытанні гістарычна-культурнай спадчыны.

У банку звестак могуць захоўвацца эталоны духоўных фіксаваных каштоўнасцей.

Дзейнасць банка звестак ажыццяўляецца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту і іншых крыніц фінансавання.

Банк звестак бясплатна дае магчымасць азнаёміцца з сабранай у ім інфармацыяй толькі тым юрыдычным і фізічным асобам, якія даюць яму інфармацыю аб усіх выяўленых імі новых звестках і падрыхтаваных матэрыялах аб гістарычна-культурнай спадчыне Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Артыкул 35. Калекцыя. Правы ўласніка калекцыі

Калекцыя - гэта навукова абгрунтаваны збор рухомых матэрыяльных каштоўнасцей або эталонаў фіксаваных духоўных каштоўнасцей, які належыць аднаму ўласніку.

Фізічная ці юрыдычная асоба, якая з'яўляецца ўласнікам калекцыі, прызнанай каштоўнасцю, за выключэннем калекцый архіўных матэрыялаў, мае права бясплатна атрымаць наступныя паслугі ад дзяржаўных музеяў:

1) устанаўленне аўтарства (прыналежнасці) прадметаў калекцыі;

2) вызначэнне ўмоў захавання прадметаў калекцыі;

3) дапамогу ў правядзенні навуковай інвентарызацыі і навуковай апрацоўкі прадметаў калекцыі;

4) гарантыі бяспекі калекцыі ці яе асобных прадметаў у час экспанавання ў музеях і перавозкі.

Забараняецца разукамплектаванне сукупнасці рухомых матэрыяльных каштоўнасцей, якія ўяўляюць:

1) прызначаныя або сабраныя для канкрэтных мэт (аздабленне інтэр'ераў і г.д. ) камплекты;

2) складзеныя на навуковых прынцыпах калекцыі.

У выпадку, калі адна і тая ж каштоўнасць належыць і да навукова абгрунтаваных калекцый, і да спецыяльна прызначаных камплектаў аздаблення, прыярытэт аддаецца навукова абгрунтаваным калекцыям.

## Артыкул 36. Фонд аховы, зберажэння і аднаўлення гістарычна-культурнай спадчыны народа Беларусі

Фонд аховы, зберажэння і аднаўлення гістарычна-культурнай спадчыны народа Беларусі (далей - Фонд аховы спадчыны) існуе пры ДзІнАС і з'яўляецца мэтавым фондам. Сродкі Фонду аховы спадчыны складаюцца:

1) з добраахвотных ахвяраванняў, якія зроблены любымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку і замежнымі;

2) з адлічэнняў ад прыбыткаў, атрыманых пры выкарыстанні гістарычна-культурных каштоўнасцей у камерцыйных мэтах і ў выніку дзейнасці, якая непасрэдна ўздзейнічае на каштоўнасці;

3) з кампенсацый і штрафаў, якія спаганяюцца за дзейнасць, якая прама ці ўскосна шкодзіць гістарычна-культурным каштоўнасцям, за абмежаванне доступу насельніцтва да каштоўнасцей або за парушэнне рэжымаў зон аховы нерухомых матэрыяльных каштоўнасцей.

Сродкі Фонду аховы спадчыны могуць выкарыстоўвацца толькі ў адпаведнасці з яго мэтамі: на пэўныя мерапрыемствы і праграмы, калі такія абумоўлены пры ахвяраванні сродкаў любымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі (у тым ліку і замежнымі).

## Артыкул 37. Археалагічная спадчына і яе ахова

1. Археалагічная спадчына ўяўляе сабой сукупнасць археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў, у тым ліку помнікаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

археалогii.

Археалагічныя аб'екты - нерухомыя матэрыяльныя аб'екты або іх комплексы, якія ўзніклі ў выніку дзейнасці чалавека ў мінулы час і захаваліся ў культурным слоі або на дне прыродных і штучных вадаёмаў.

Археалагічныя артэфакты - рухомыя матэрыяльныя аб'екты, якія ўзніклі ў выніку дзейнасці чалавека ў мінулы час, захаваліся ў культурным слоі або на дне прыродных і штучных вадаёмаў, маюць гістарычнае, мастацкае, навуковае або іншае культурнае значэнне, могуць адпавядаць крытэрыям для надання статусу гістарычна-культурнай каштоўнасці і на момант іх выяўлення не маюць уласніка.

Культурны пласт - пласт у зямлі або пад вадой, які ўтварыўся ў выніку жыцця і дзейнасці чалавека і ўтрымлівае сляды існавання чалавека.

2. Да археалагічных аб'ектаў адносяцца:

2.1. рэшткі ўмацаваных пасяленняў (старажытных гарадоў, гарадзішчаў, замкаў), неўмацаваных пасяленняў (старажытных стаянак, паселішчаў, асобнага жылля), капітальных пабудоў (будынкаў, збудаванняў), іншых аб'ектаў (свяцілішчаў, месцаў спраўляння абрадаў, прошчаў, кляштараў, манастыроў, храмаў);

2.2. крыжы, культавыя камяні, статуі, абеліскі;

2.3. курганныя і грунтавыя могільнікі, асобныя пахаванні, некропалі, маўзалеі і іншыя пахаванні;

2.4. інфраструктура сухапутных, водных і водна-волакавых шляхоў;

2.5. старажытныя крамянёвыя шахты-капальні.

3. Ахова археалагічнай спадчыны - кірунак культурнай дзейнасці, які ўключае сістэму арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і (або) іншых мер, накіраваных на выяўленне археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў, іх вывучэнне, улік археалагічных аб'ектаў, захаванне, аднаўленне, утрыманне і выкарыстанне археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў, што ажыццяўляюцца ў мэтах захавання археалагічнай спадчыны.

4. Прафесійна і выпадкова выяўленыя археалагічныя артэфакты падлягаюць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць у парадку, вызначаным Заканадаўствам.

5. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь забараняюцца набыццё, продаж, дарэнне, мена, залог і перасылка археалагічных артэфактаў, за выключэннем набыцця, продажу, дарэння, мены археалагічных артэфактаў дзяржаўнымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кова-даследчую і музейную дзейнасць, у мэтах вывучэння археалагічных артэфактаў і камплектавання музейных фондаў.

6. Археалагічныя аб'екты падлягаюць ахове, як і матэрыяльныя гістарычна-культурныя каштоўнасці без катэгорыі.

## Артыкул 38. Інфармацыя аб археалагічных аб'ектах

У Рэспубліцы Беларусь вядзецца рээстр археалагічных аб'ектаў, які ўтрымлівае інфармацыю аб археалагічных аб'ектах і іх тэрыторыях.

1. Тэрыторыя археалагічнага аб'екта - участак зямлі або вадаёма, заняты археалагічным аб'ектам і звязаны з ім гістарычна і функцыянальна.

2. Рээстр археалагічных аб'ектаў вядзецца ў мэтах:

2.1. арганізацыі ўліку археалагічных аб'ектаў;

2.2. стварэння адзінай базы даных аб археалагічных аб'ектах і іх тэрыторыях;

2.3. прадстаўлення звестак, якія ў ім змяшчаюцца.

3. Вядзенне рээстра археалагічных аб'ектаў уяўляе сабой збор звестак аб археалагічных аб'ектах і іх тэрыторыях, іх сістэматызацыю і актуалізацыю.

4. Фарміраванне і вядзенне рээстра археалагічных аб'ектаў ажыццяўляецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

5. Доступ да дадзеных рээстра археалагічных аб'ектаў забяспечваецца шляхам:

5.1. знаёмства з зямельна-кадастравай картай (або планам) адпаведнага раёна;

5.2. давядзення інфармацыі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі да землекарыстальнікаў, на зямельных участках якіх размешчаны археалагічныя аб'екты;

5.3. навукова-папулярных і навуковых публікацый аб правядзенні археалагічных даследаванняў і іх выніках.

6. Інфармацыя аб археалагічных аб'ектах, якая атрымана ў ходзе правядзення работ на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў, прадастаўляецца ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі (Інстытут гісторыі).

7. Археалагічныя аб'екты могуць быць пазбаўлены статусу гістарычна-культурнай каштоўнасці пасля іх поўнага навуковага даследавання, неабходнасць якога абумоўлена вырашэннем выключных (па вызначэнню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь) народнагаспадарчых задач.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Артыкул 39. Рэлігійная спадчына

Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа.

Прызнаючы роўнасць усіх рэлігій перад законам, беларуская дзяржава прызнае:

1) значную ролю Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;

2) духоўную, культурную і гістарычную ролю Каталіцкага касцёла (у тым ліку і ўніяцкай царквы) на тэрыторыі Беларусі;

3) неад'емную частку ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангельскіх цэркваў, іўдаізму і ісламу;

Рэлігійнай спадчынай беларускага народа з'яўляюцца:

1. Культавыя будынкі храмаў розных канфесій.

2. Кляштары, манастыры, гістарычныя могілкі, капліцы, прыдарожныя крыжы і прошчы.

3. Традыцыйныя гістарычныя рэлігійныя абрады, рытуалы і цырымоніі (у тым ліку пілігрымкі, крыжовыя хады і вадохрышчы).

4. Старажытныя рэлігійныя кнігі і рэчы рэлігійнага культу (у тым ліку абразы).

Дзяржава ў парадку, вызначаным заканадаўствам, дапамагае рэлігійным арганізацыям у рэстаўрацыі культавых будынкаў і іншых рэчаў, якія з'яўляюцца гістарычна-культурнымі каштоўнасцямі.

## Артыкул 40. Гістарычна-культурная спадчына і турызм

Гістарычна-культурная спадчына беларускага народа з'яўляецца аб'ектам зацікаўленасці айчыннага і міжнароднага турызму. У мэтах садзейнічання развіццю розных напрамкаў турызму на Беларусі, а таксама і за яе межамі ствараюцца турыстычна-інфармацыйныя цэнтры.

Турыстычна-інфармацыйныя цэнтры ажыццяўляюць збор, апрацоўку, аналіз і распаўсюджванне інфармацыі аб помніках мастацтва, гісторыі і архітэктуры Беларусі, аб тэмах экскурсій, розных культурна-масавых мерапрыемствах, выставах і фэстах.

Па прапанове дзяржаўных органаў, юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў у месцах канцэнтрацыі найбольш цікавых помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ствараюцца турыстычныя зоны ў парадку, вызначаным Урадам Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Установы культуры бяруць непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы экскурсаводаў, зацвярджаюць тэматыку турыстычных маршрутаў і экскурсій.

## Раздзел 6

## БЕЛАРУСКАЯ МОВА - АСНОЎНЫ КАМПАНЕНТ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

### Артыкул 41. Статус беларускай мовы

1. Беларуская мова - нацыянальная мова беларускага народа.
2. Беларуская мова - афіцыйная мова Рэспублікі Беларусь.
3. Беларуская мова - тытульная мова Рэспублікі Беларусь.
4. Беларуская мова ва ўсіх формах яе вуснага і пісьмовага бытавання і незалежна ад ступені кадыфікацыі з'яўляецца нематэрыяльнай культурнай каштоўнасцю, якая ахоўваецца дзяржавай.
5. Аб'ектамі аховы дзяржавы ёсць беларуская вусная і пісьмовая літаратурная мова, лексіка і фразеалогія, дыялектная мова, старабеларуская мова, старажытныя беларускія алфавіты (кірыліца і лацінка), графічныя сістэмы і арфаграфічныя традыцыі, тапанімія, традыцыйны іменаслоў і сістэмы наймення людзей.
6. Беларуская мова як гуманітарная субстанцыя з'яўляецца прыналежнасцю, а, значыць, і ўласнасцю беларускага этнасу і Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 42. Асноўныя кірункі дзяржаўнай моўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

1. Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе заканадаўчую, арганізацыйную і фінансавую падтрымку беларускай мовы ў формах і аб'ёмах, неабходных для забеспячэння паўнавартаснага функцыянавання і развіцця беларускай мовы, падтрымання яе прэстыжу ва ўсіх сферах жыцця краіны, у прыватнасці:

1.1. спрыяе росту моўнай культуры грамадзян;

1.2. стварае ўмовы для захавання дыялектаў;

1.3. стварае ўмовы для захавання помнікаў пісьменства беларускага народа і прымае захады для вяртання помнікаў пісьменства, што знаходзяцца па-за межамі Беларусі;

1.4. забяспечвае матэрыяльную базу для функцыянавання беларускай мовы;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.5. забяспечвае фарміраванне і развіццё беларускай тэрміналогіі для ўсіх галін навукі, усіх сфер дзяржаўнай дзейнасці і гаспадаркі;

1.6. падтрымлівае як прыярытэтныя галіны навукі, якія займаюцца даследаваннем беларускай мовы, аказвае дзяржаўную падтрымку выданню навуковых і папулярных прац у пытаннях беларускай мовы, перакладаў на беларускую мову даведкавай, навучальна-метадычнай, мастацкай літаратуры, мастацкіх, дакументальных, мультыплікацыйных, навучальных фільмаў.

2. Беларуская дзяржава абараняе моўныя правы беларусаў у дыяспарах і на абшарах традыцыйнага рассялення беларусаў за мяжой, падтрымлівае адпаведныя ініцыятывы, а таксама ажыццяўляе захады з мэтай надання беларускай мове афіцыйнага статусу на гэтых абшарах. Дзяржава падтрымлівае адкрыццё факультэтаў і кафедр беларускай мовы, а таксама беларускіх школ і беларускамоўных выданняў (газеты, часопісы, альманахі) у замежных краінах - у першую чаргу там, дзе існуюць беларускія дыяспары.

3. Дзяржава прымае захады для надання беларускай мове афіцыйнага статусу ва ўсіх міждзяржаўных утварэннях, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь.

4. У Рэспубліцы Беларусь распрацоўваюцца і ажыццяўляюцца дзяржаўныя і агульнанацыянальныя праграмы падтрымкі беларускай мовы.

4.1. Дзяржаўныя і агульнанацыянальныя праграмы па падтрымцы беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь, са сродкаў спецыяльных фондаў падтрымкі беларускай мовы; могуць прыцягвацца таксама сродкі айчынных і замежных спонсараў, якія пры гэтым не падлягаюць абкладанню падаткамі, зборамі (пошлінамі).

## Артыкул 43. Арганізацыя дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы

Гарантам годнага бытавання і свабоднага развіцця беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Інтэлектуальнае і арганізацыйнае забеспячэнне дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы ажыццяўляе Дэпартамент беларускай мовы пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы ажыццяўляе Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусь.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Арганізацыйную і фінансавую падтрымку беларускай мовы ажыццяўляе Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Адзін раз на пяць гадоў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прымае дэталёвы план выканання гэтага Закона з улікам палажэнняў дзяржаўных і агульнанацыянальных праграм па падтрымцы беларускай мовы і размяркоўвае адказнасць за выкананне плана паміж адпаведнымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання.

Юрыдычную абарону беларускай мовы ажыццяўляюць праваахоўныя структуры, суды і Пракуратура Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 44. Дэпартамент беларускай мовы пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

1. Дэпартамент беларускай мовы пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (далей - Дэпартамент беларускай мовы) ёсць арганізацыйна-выканаўчым органам, які ствараецца з мэтай арганізацыі выканання гэтага Закона.

У сваёй дзейнасці Дэпартамент беларускай мовы кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам, іншымі нарматыўнымі праўнымі актамі Рэспублікі Беларусь.

2. Паўнамоцтвы Дэпартамента беларускай мовы і парадак яго працы вызначаецца Статутам (Рэгламентам) Дэпартамента беларускай мовы, які зацвярджаецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

2.1. Памяшканне для працы Дэпартамента беларускай мовы забяспечвае Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

2.2. Колькасны і персанальны склад Дэпартамента беларускай мовы зацвярджае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

2.3. Дэпартамент беларускай мовы ўзначальвае Старшыня, які прызначаецца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Дэпартамент беларускай мовы:

3.1. разглядае канкрэтныя пытанні выканання гэтага Закона;

3.2. падае ў органы дзяржаўнага кіравання прапановы па выкананні гэтага Закона;

3.3. разглядае праекты актаў заканадаўства, палажэнні якіх маюць дачыненне да сферы прымянення гэтага Закона, і падае ў органы дзяржаўнага кіравання высновы наконт праектаў актаў заканадаўства, якія датычаць аховы і выкарыстання беларускай мовы;

3.4. ухваляе колькасць і крытэрыі надання кваліфікацыйных катэгорый валодання беларускай мовай, неабходных для дзяржаўных службоўцаў розных сфер дзейнасці;

3.5. вызначае прыярытэтныя кірункі кадыфікацыі беларускай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратурнай мовы;

3.6. ацэньвае і зацвярджае найважнейшыя нарматыўныя мовазнаўчыя працы (слоўнікі, даведнікі, дапаможнікі, падручнікі);

3.7. у супрацоўніцтве з іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі ўстановамі ды арганізацыямі вырашае пытанні ўкаранення беларускай мовы ў інфармацыйныя тэхналогіі;

3.8. вырашае пытанні замены беларускімі адпаведнікамі іншамоўных тэрмінаў;

3.9. дбае пра зберажэнне дыялектаў беларускай мовы;

3.10. клапоціцца пра захаванне традыцыйных беларускіх геаграфічных назваў, зацвярджае іх спіс і вызначае парадак ужывання;

3.11. вызначае шляхі рэалізацыі права грамадзян на выкарыстанне традыцыйнага беларускага іменаслову і традыцыйнай сістэмы наймення людзей;

3.12. сочыць за культурай беларускай мовы ў адукацыі, у сродках масавай інфармацыі, у выдавецкай дзейнасці, у навуцы, у грамадскім жыцці, у іншых галінах.

## Артыкул 45. Дзяржаўна-грамадская камісія Дэпартамента беларускай мовы

1. Дзяржаўна-грамадская камісія Дэпартамента беларускай мовы (далей - Камісія) - кансультатыўна-дарадчы (экспертны) орган, які ствараецца з мэтай пастаяннага нагляду за выкананнем гэтага Закона, адсочвання моўных працэсаў у грамадстве і ўнясення прапаноў у дзейнасць Дэпартамента беларускай мовы.

2. Камісія складаецца з экспертаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, універсітэтаў, прадстаўнікоў профільных грамадскіх арганізацый, у тым ліку творчых саюзаў і арганізацый навукоўцаў, а таксама прадстаўнікоў усіх канфесій, якія вядуць богаслужбу і іншую дзейнасць на беларускай мове (Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, Саюз беларускіх пісьменнікаў, Саюз пісьменнікаў Беларусі, ПЭН-Цэнтр, Таварыства беларускай школы, Саюз журналістаў і Беларуская асацыяцыя журналістаў).

3. Члены Камісіі прызначаюцца на 5 гадоў. Колькасць тэрмінаў удзелу ў Камісіі не абмяжоўваецца. Час пачатку паўнамоцтваў члена Камісіі адлічваецца з дня яго прызначэння ў склад Камісіі.

3.1. Камісію ўзначальвае старшыня Дэпартамента беларускай мовы.

3.2. Камісія праводзіць пасяджэнні. Пасяджэнні Камісіі праводзяцца не радзей як адзін раз на месяц. Пасяджэнне Камісіі лічыцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правамоцным, калі на ім прысутныя не менш як 2/3 членаў Камісіі беларускай мовы.

3.3. Па выніку разгляду пытанняў Камісія прымае рашэнні. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала не менш за 2/3 прысутных членаў Камісіі.

## Артыкул 46. Дзяржаўная інспекцыя Дэпартамента беларускай мовы

1. Дзяржаўная інспекцыя Дэпартамента беларускай мовы (далей - Інспекцыя) - спецыяльна ўпаўнаважаны дзяржаўны орган, падпарадкаваны Старшыні Дэпартамента беларускай мовы, які ажыццяўляе ў межах сваёй кампетэнцыі нагляд і кантроль за выкананнем заканадаўства аб беларускай мове.

1.1. У сваёй дзейнасці Інспекцыя кіруецца Канстытуцыяй, гэтым Законам, іншымі актамі заканадаўства.

1.2. Статут Інспекцыі зацвярджае Старшыня Дэпартамента беларускай мовы.

1.3. Структура Інспекцыі зацвярджаецца Старшынёй Дэпартамента беларускай мовы па прадстаўленні Дырэктара Інспекцыі.

2. Інспекцыя ёсць юрыдычнай асобай, мае гербавую пячатку са сваім найменнем, банкаўскія рахункі.

3. Пры Інспекцыі дзейнічае міжканфесійная камісія адзінай беларускай тэрміналогіі, якая ствараецца на грамадскай аснове.

4. Фінансаванне Інспекцыі ажыццяўляецца з бюджэту Дэпартамента беларускай мовы і іншых крыніц, не забароненых законам.

5. Супрацоўнікі Інспекцыі, за выключэннем асобаў, што забяспечваюць яе функцыянаванне і ажыццяўляюць тэхнічнае абслугоўванне, з'яўляюцца дзяржаўнымі службоўцамі.

6. Задачай Інспекцыі з'яўляецца ажыццяўленне кантролю за выкананнем гэтага Закона, іншых праўных нормаў, якія забяспечваюць ахову і выкарыстанне беларускай мовы.

7. З мэтай рэалізацыі ўскладзенай на яе задачы Інспекцыя ажыццяўляе наступныя функцыі:

7.1. ажыццяўляе праверкі выканання патрабаванняў заканадаўства аб беларускай мове рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, органамі мясцовага кіравання і самакіравання, усімі ўстановамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, рэлігійнымі арганізацыямі і прадухіляе правапарушэнні ў сферы аховы і выкарыстання беларускай мовы;

7.2. запытвае ў дзяржаўных органаў, іншых юрыдычных асоб,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а таксама фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, рэлігійных арганізацый тлумачэнні прычын выяўленых парушэнняў заканадаўства ў сферы аховы і выкарыстання беларускай мовы, а таксама прычын і ўмоў, што спрыяюць іх ажыццяўленню;

7.3. у межах сваёй кампетэнцыі выдае абавязковыя для выканання дзяржаўнымі органамі, іншымі юрыдычнымі асобамі, а таксама фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, рэлігійнымі арганізацыямі, прадпісанні аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў заканадаўства ў сферы аховы і выкарыстання беларускай мовы, а таксама прычын і ўмоў, што спрыяюць іх ажыццяўленню;

7.4. у межах сваёй кампетэнцыі рыхтуе і ва ўстаноўленым парадку ўносіць праекты нарматыўных прававых актаў па пытаннях аховы і выкарыстання беларускай мовы, узгадняе падрыхтаваныя іншымі дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі праекты нарматыўных прававых актаў па гэтых пытаннях;

7.5. вызначае і кантралюе механізм надання дзяржаўным службоўцам кваліфікацыйных катэгорый валодання беларускай мовай;

7.6. запытвае ў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, іншых юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў і бязвыплатна атрымлівае ад іх інфармацыю, неабходную для выканання ўскладзенай на Інспекцыю задачы;

8. Інспекцыя складае справаздачы перад Старшынёй Дэпартамента беларускай мовы, абменьваецца інфармацыяй па сваёй дзейнасці з Камісіяй Дэпартамента беларускай мовы. Прадстаўнікі Інспекцыі маюць права ўдзельнічаць у паседжаннях Камісіі Дэпартамента беларускай мовы.

9. Інспекцыю ўзначальвае Дырэктар. Дырэктар прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад яе Старшынёй Дэпартамента беларускай мовы са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дырэктар мае намесніка, які прызначаецца на пасаду Старшынёй Дэпартамента беларускай мовы па прадстаўленні Дырэктара Інспекцыі.

**Артыкул 47. Дзейнасць Міністэрства культуры па забеспячэнні паўнавартаснага функцыянавання беларускай мовы ў сістэме культуры**

1. У Рэспубліцы Беларусь прыярытэтнай мовай сферы культуры з'яўляецца беларуская мова. Гарантуецца захаванне і развіццё культуры на мовах іншых народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у краіне.

2. Міністэрства культуры Рэспубліка Беларусь арганізуе далучэнне насельніцтва краіны да здабыткаў сусветнай культуры, ажыццяўляе пераклад на беларускую мову кніг, фільмаў, серыялаў, стварае беларускамоўныя аналагі найбольш масавых і папулярных шоў і забаўляльных праграмаў, спрыяе пашырэнню беларускай мовы пры правядзенні рэлігійных абрадаў, набажэнстваў і казанняў.

3. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь клапоціцца аб захаванні культурных здабыткаў беларускага этнасу ў дыяспарах, аказвае калектывам і арганізацыям культуры дыяспараў арганізацыйную і матэрыяльную падтрымку.

4. Асноўнай мовай праграм беларускіх дзеячоў культуры, якія прадстаўляюцца на міжнародныя конкурсы і фестывалі з'яўляецца беларуская мова.

## Раздзел 7

## ПАРАДАК ДЗЕЙНАСЦІ АСОБНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ

### Артыкул 48. Музеі

1. Музей - арганізацыя культуры альбо падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія выяўляюць прадметы музейнага знішчэння, камплектуюць музейныя фонды, робяць пастаянныя ці часовыя экспазіцыі, праводзяць экскурсіі і займаюцца навуковай дзейнасцю, спрыяюць развіццю краязнаўства.

2. Па форме ўласнасці музеі падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя.

3. Роля музея заключаецца ў захаванні і папулярызацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, уключаючы помнікі гісторыі і культуры, традыцыі, рамёствы, этнакультурнае і прыроднае асяроддзе.

4. Накірункі развіцця і дзейнасці музея вызначаюцца ў адпаведнасці з яго профілем і канцэпцыяй развіцця музея, што зацвярджаецца заснавальнікам музея.

### Артыкул 49. Бібліятэкі

1. Бібліятэка - арганізацыя культуры альбо падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія ажыццяўляюць збор і забяспечваюць захаванасць дакументаў з мэтай задавальненняў інфармацыйных патрэб



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікаў.

2. Па форме ўласнасці бібліятэкі падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя. Усе дзяржаўныя бібліятэкі адчынены для публічнага наведвання.

3. Па прызначэнні дзяржаўныя бібліятэкі падзяляюцца на публічныя і спецыяльныя.

4. Асноўнымі прынцыпамі дзейнасці бібліятэк з'яўляюцца:

4.1. садзейнічанне адраджэнню і развіццю культурных традыцый і захаванню культурных каштоўнасцей беларускай нацыі, іншых нацыянальнасцей, якія жывуць у Беларусі, захаванасці гістарычна-культурнай спадчыны;

4.2. распаўсюджванне гуманістычных ідэй, навуковых і прававых ведаў і дасягненняў сусветнай культуры;

4.3. агульнадаступнасць інфармацыі аб змесце бібліятэчных фондаў.

### Артыкул 50. Клубныя ўстановы

1.Клубнай установай прызнаецца ўстанова культуры, якая ажыццяўляе асветныя, выхаваўчыя і забаўляльныя функцыі праз стварэнне фізічнымі асобамі спрыяльных умоў для заняцця народнай і мастацкай творчасцю, задавальнення іх пазнавальных патрэбаў, а таксама патрэбаў у самаадукацыі, духоўным і фізічным развіцці, міжасобасных адносінах і адпачынку.

2. Дзяржаўныя клубныя ўстановы даступныя для наведвання іх фізічнымі асобамі. Дзейнасць дзяржаўных клубных устаноў грунтуецца на добраахвотнасці ўдзелу фізічных асоб у клубных фарміраваннях, прызнанні ў якасці асновы іх функцыянавання грамадскай ініцыятывы і самадзейнасці, на спалучэнні індывідуальнай і групавой работы, кіравання і самакіравання.

3. Статут клубнай установы павінен змяшчаць указанне на правы і абавязкі фізічных асоб, якія наведваюць клубную ўстанову.

4. Віды клубных устаноў, іх прававое становішча і парадак дзейнасці вызначаюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 51. Тэатры, цыркі і канцэртныя арганізацыі

1. Тэатрам, цыркам або канцэртнай арганізацыяй прызнаецца арганізацыя культуры, якая ажыццяўляе падрыхтоўку, арганізацыю, паказ і правядзенне спектакляў, канцэртаў або іншых публічных паказаў з мэтай эстэтычнага выхавання фізічных асоб, фарміравання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і задавальнення іх патрэбаў у сцэнічным (музычным) мастацтве, папулярызацыі твораў сцэнічнага (музычнага) мастацтва, а таксама мастацкай творчасці выканаўчых калектываў і асобных выканаўцаў.

2. Усе тэатры, цыркі і канцэртныя арганізацыі, а таксама храмы розных канфесій, дзе адбываюцца культурныя мерапрыемствы (батлейкі, хоры, канцэрты арганнай музыкі і інш.), адчынены для публічнага наведвання і прагляду спектакляў, іншых публічных паказаў, праслухоўвання твораў музычнага мастацтва.

3. У тэатры, цырку або канцэртнай арганізацыі ствараецца і дзейнічае мастацкі савет. Мастацкі савет з'яўляецца пастаянна дзеючым дарадчым органам, які забяспечвае ўдзел калектыву тэатра, цырка або канцэртнай арганізацыі ў вырашэнні творчых пытанняў.

4. Па форме ўласнасці тэатры, цыркі і канцэртныя арганізацыі падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя.

### Артыкул 52. Паркі

1. Паркамі прызнаюцца арганізацыі культуры, якія ажыццяўляюць забаўляльныя, асветныя, эстэтычна- і эколага-выхаваўчыя функцыі праз стварэнне на сваёй тэрыторыі спрыяльных умоў для адпачынку і забаў фізічных асоб, распаўсюджвання і папулярызацыі культурных каштоўнасцей і ведаў аб прыродзе, фарміравання беражлівых і гуманных адносін да навакольнага асяроддзя.

2. Усе паркі адчынены для публічнага наведвання.

3. Статут парку павінен змяшчаць указанне на землекарыстальніка, звесткі аб зямельным участку, што складае тэрыторыю парку, вызначаць правы, абавязкі парку і фізічных асоб, якія наведваюць парк.

4. Парк ствараецца са згоды мясцовага выканаўчага і распарадчага органа на месцы знаходжання тэрыторыі парку.

5. Парк абавязаны мець генеральны план, зацверджаны адпаведным мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

6. Адносіны паміж паркам і мясцовым выканаўчым і распарадчым органам на месцы знаходжання тэрыторыі парку рэгулююцца дагаворам.

7. Правядзенне паркам мерапрыемстваў або ажыццяўленне іншай дзейнасці, якія могуць мець экалагічныя, сацыяльныя і іншыя вынікі, што закранаюць інтарэсы насельніцтва адпаведнай тэрыторыі, узгадняюцца з мясцовым выканаўчым і распарадчым органам па месцы знаходжання тэрыторыі парку.

8. Парк ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці арганізацый

грамадскага харчавання, гандлю, камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання і азелянення, а таксама іншых арганізацый, размешчаных на тэрыторыі парку.

9. Прававое становішча паркаў, парадак іх дзейнасці вызначаюцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 53. Арганізацыі кінематаграфіі

1. Юрыдычная асоба, якая ажыццяўляе ў якасці асноўнага віду дзейнасці кінематаграфічную дзейнасць, з'яўляецца арганізацыяй кінематаграфіі.

2. Кінематаграфічная дзейнасць - кірунак культурнай дзейнасці, які звязаны з вытворчасцю, паказам і распаўсюджваннем фільмаў.

3. Віды арганізацый кінематаграфіі:

3.1. кінавытворчыя - арганізацыі кінематаграфіі, асноўным відам дзейнасці якіх з'яўляецца вытворчасць фільмаў;

3.2. кінавідовішчныя - арганізацыі кінематаграфіі, асноўным відам дзейнасці якіх з'яўляецца паказ фільмаў;

3.3. кінапракатныя - арганізацыі кінематаграфіі, асноўным відам дзейнасці якіх з'яўляецца распаўсюджванне фільмаў.

4. Па форме ўласнасці арганізацыі кінематаграфіі падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя.

### Артыкул 54. Установы адукацыі і пазашкольнае выхаванне

1. Да ўстаноў адукацыі ў галіне культуры адносяцца ўстановы, якія падпарадкоўваюцца Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь або галоўным упраўленням, упраўленням, аддзелам культуры мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і забяспечваюць атрыманне агульнай, базавай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай і паслявузаўскай адукацыі, павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўку работнікаў культуры, а таксама пазашкольнае выхаванне і навучанне ў сферы культуры.

2. Установы адукацыі, якія не адносяцца да ўстаноў адукацыі ў галіне культуры, могуць вырашаць асобныя задачы ў галіне культуры.

3. Установамі пазашкольнага выхавання і навучання ў галіне культуры прызнаюцца ўстановы, якія ажыццяўляюць эстэтычна-выхаваўчыя і асветныя функцыі праз мэтанакіраванае навучанне дзяцей і моладзі розным відам мастацтваў, стварэнне спрыяльных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

умоў для развіцця і рэалізацыі творчых здольнасцей, прафесійнага самавызначэння, у тым ліку і нядзельныя школы розных канфесій. Пералік устаноў пазашкольнага выхавання і навучання ў галіне культуры зацвярджаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Прававое становішча, парадак дзейнасці ўстаноў пазашкольнага выхавання і навучання ў галіне культуры вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## Раздзел 8

## КАДРАВАЕ І ФІНАНСАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Артыкул 55. Падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў культуры

1. Падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў культуры ажыццяўляюцца ва ўстановах адукацыі, іншых арганізацыях у адпаведнасці з заканадаўствам.

2. Падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка работнікаў культуры ажыццяўляюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, сродкаў фізічных і юрыдычных асоб.

3. Парадак падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў культуры, прысваення ім кваліфікацыйных катэгорый вызначаецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Работнікі культуры, акрамя дзеячаў культуры і мастацтва, падлягаюць атэстацыі не радзей, чым адзін раз у пяць гадоў, калі заканадаўчымі актамі не ўстаноўлены іншы тэрмін.

5. Парадак правядзення атэстацыі работнікаў культуры, а таксама кола асоб, якія не падлягаюць атэстацыі, вызначаюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

### Артыкул 56. Фінансаванне культурнай дзейнасці

1. Асновай дзяржаўных гарантый захавання, развіцця і распаўсюджвання культуры з'яўляецца фінансаванне з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

2. Фінансаванне дзейнасці дзяржаўных устаноў культуры, дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры, дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, а ў выпадках,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадугледжаных заканадаўствам, - іншых культурных праграм (праектаў, мерапрыемстваў) ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і запланаванай расходнай часткай мясцовых бюджэтаў у памеры не менш чым 2,5 % ад агульнай сумы адпаведных бюджэтаў.

3. Дзяржаўныя сродкі, выдзеленыя на развіццё культуры, размяркоўваюцца па кварталах наступным чынам.

3.1. I квартал - 20 % бюджэта;

3.2. II квартал - 30 % бюджэта;

3.3. III квартал - 30 % бюджэта;

3.4. IV квартал - 20 % бюджэта;

3.5. Міністэрства культуры размяркоўвае сродкі на падтрыманне канкрэтных праектаў публічна ў форме грантаў і на падставе адпаведных тэндараў.

4. Дадатковымі крыніцамі фінансавання дзейнасці ўстаноў культуры з'яўляюцца:

4.1. даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, калі ажыццяўленне такой дзейнасці прадугледжана статутам установы культуры і заканадаўствам;

4.2. крэдыты банкаў;

4.3. добраахвотныя ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб;

4.4. іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўчымі актамі.

5. Юрыдычныя і фізічныя асобы маюць права ў адпаведнасці з заканадаўствам ствараць фонды для фінансавання культурнай дзейнасці.

6. Памеры выдаткаў, якія дадаткова выдзяляюцца на гэтыя мэты з абласных, раённых, гарадскіх бюджэтаў, вызначаюцца мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў.

7. За кошт прадугледжаных у гэтым артыкуле сродкаў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь і органы выканаўчай улады на месцах могуць фінансаваць мерапрыемствы па зберажэнню і аднаўленню любых каштоўнасцей народа Беларусі незалежна ад таго, у чыёй уласнасці або на чыёй тэрыторыі яны знаходзяцца.

### Артыкул 57. Фундатары і мецэнаты

1. Фундатар (спонсар) культуры - юрыдычная асоба, індывідуальны прадпрымальнік, якія прадастаўляюць юрыдычным асобам, грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, бязвыплатную дапамогу ў мэтах аховы гістарычна-культурнай спадчыны, развіцця бібліятэчнай і музейнай справы, кінематаграфіі, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, манументальнага, музыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага, тэатральнага, харэаграфічнага, эстраднага, цыркавога і іншых відаў мастацтва (у тым ліку стварэння новых твораў, падрыхтоўку канцэртных праграм, пастаноўку спектакляў, правядзенне выставак), а таксама развіцця і падтрымкі народнай творчасці, народных мастацкіх рамёстваў, адукацыі ў сферы культуры, правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў беларускімі калектывамі мастацкай творчасці і выканаўцамі.

2. Фундатары (спонсары) культуры прадастаўляюць бязвыплатную дапамогу ў выглядзе грашовых сродкаў, у тым ліку ў замежнай валюце, тавараў (маёмасці), работ, паслуг, маёмасных правоў, у тым ліку выключных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, на ўмовах і ў парадку, якія вызначаюцца актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

3. Мецэнат культуры - грамадзянін, які робіць ахвяраванні ў мэтах развіцця культуры, падтрымкі культурнай дзейнасці, у тым ліку захавання, развіцця і распаўсюджвання беларускай нацыянальнай культуры і мовы, аховы гістарычна-культурнай спадчыны, развіцця музейнай і бібліятэчнай справы, кінематаграфіі, адраджэння і развіцця гістарычных традыцый народнай творчасці, падтрымкі таленавітых аўтараў і выканаўцаў, калектываў мастацкай творчасці, папулярызацыі эстэтычных і маральных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры.

4. Мецэнаты культуры робяць ахвяраванні ў адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

5. Фундатары і мецэнаты культуры маюць падатковыя льготы, устаноўленыя Урадам Беларусі.

## Раздзел 9

## МІЖНАРОДНАЕ КУЛЬТУРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

### Артыкул 58. Задачы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва

1. Задачамі суб'ектаў культурнай дзейнасці пры ажыццяўленні міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца:

1.1. узбагачэнне культурнага жыцця беларускага народа, далучэнне грамадзян, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, да каштоўнасцей сусветнай культуры;

1.2. азнаямленне сусветнай грамадскасці з культурай Беларусі;

1.3. інтэграцыя беларускай нацыянальнай культуры ў сусветную культуру і сусветную інфармацыйную прастору.

## Артыкул 59. Прынцыпы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва

1. Суб'екты культурнай дзейнасці пры ажыццяўленні міжнароднага культурнага супрацоўніцтва кіруюцца наступнымі прынцыпамі:

1.1. Прызнанне і павага годнасці, каштоўнасці і неабходнасці захавання кожнай культуры, роўнасць культур, роўная вартасць нацыянальных культур для сусветнай культуры, разгляд усіх культур у іх разнастайнасці ў якасці складовай часткі агульнага набытку чалавецтва;

1.2. Служэнне культуры справе міру, развіццю мірных і дружалюбных адносін паміж дзяржавамі;

1.3. Узаемавыгаднасць (узаемная карысць) культурнага супрацоўніцтва;

1.4. Абавязковасць абароны культурных каштоўнасцей у мірны і ваенны час;

1.5. Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей.

## Артыкул 60. Кірункі і прававыя асновы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва

1. Кірункамі міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца:

1.1. Міжнародны культурны абмен;

1.2. Культурныя сувязі з суайчыннікамі, якія пражываюць за мяжой;

1.3. Захаванне і ахова культурных каштоўнасцей;

1.4. Сумесная дзейнасць па стварэнні і выкарыстанні культурных каштоўнасцей;

1.5. Навукова-даследчая дзейнасць у галіне культуры;

1.6. Правядзенне фестываляў, конкурсаў, аглядаў і іншых культурных мерапрыемстваў, у тым ліку і канфесійных.

2. Прававымі асновамі міжнароднага культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Закон, міжнародныя дагаворы Рэспублікі Беларусь, рашэнні міжнародных арганізацый, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Артыкул 61. Увоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей**

1. Увоз у Рэспубліку Беларусь і вываз за яе межы культурных каштоўнасцей ажыццяўляюцца пад дзяржаўным кантролем.

2. Парадак вывазу за межы Рэспублікі Беларусь гістарычна-культурных каштоўнасцей рэгулюецца заканадаўствам аб ахове гістарычна-культурнай спадчыны.

3. Вываз на пастаяннае захоўванне за межы Рэспублікі Беларусь матэрыяльных культурных каштоўнасцей, што складаюць Бібліятэчны фонд Рэспублікі Беларусь або ўключаны ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь (за выключэннем прызнаных гістарычна-культурнымі каштоўнасцямі), а таксама прадстаўленых у Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь для разгляду пытання аб наданні ім статусу гістарычна-культурных каштоўнасцей, не дапускаецца, акрамя выпадкаў, калі такі вываз ажыццяўляецца згодна з уступіўшым у сілу міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей на падставе рашэння Урада Рэспублікі Беларусь, прынятага па кожнаму факту перамяшчэння культурных каштоўнасцей, ці іншых выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Часовы вываз за межы Рэспублікі Беларусь матэрыяльных культурных каштоўнасцей, якія складаюць Бібліятэчны фонд Рэспублікі Беларусь або ўключаны ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь (за выключэннем прызнаных гістарычна-культурнымі каштоўнасцямі або прадстаўленых ва ўстаноўленым парадку для надання ім статусу гістарычна-культурнай каштоўнасці), а таксама вываз за межы Рэспублікі Беларусь (часовы або на пастаяннае захоўванне) іншых матэрыяльных культурных каштоўнасцей (акрамя дакументаў, якія ўваходзяць у склад Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь), што адносяцца да культурных каштоўнасцей, абмежаваных да перамяшчэння праз мытную мяжу Рэспублікі Беларусь пры вывазе на падставах неэканамічнага характару, спіс якіх зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дапускаюцца пры наяўнасці дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

5. Тэрмін часовага знаходжання матэрыяльных культурных каштоўнасцей за межамі Рэспублікі Беларусь не можа перавышаць шасці месяцаў у год.

6. Дзеянне пунктаў 3 - 5 гэтага артыкула не распаўсюджваецца на культурныя каштоўнасці іншых краін, часова ўвезеныя на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і афармленыя ва ўстаноўленым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заканадаўствам парадку.

7. Матэрыяльныя культурныя каштоўнасці, вывезеныя за межы Рэспублікі Беларусь з парушэннем актаў заканадаўства і міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, якія дзейнічалі ў Рэспубліцы Беларусь на момант іх вывазу, а таксама часова вывезеныя за межы Рэспублікі Беларусь у эвакуацыю або на іншай падставе і не вернутыя ў Рэспубліку Беларусь без законных падстаў, падлягаюць абавязковаму вяртанню незалежна ад часу, абставін і месца вывазу.

## Пастанова аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб культуры"

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь "Аб Культуры" з (дата)____

2. Артыкулы 56 і 57 уступаюць у сілу праз год пасля прыняцця гэтага закона.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ